Пралетары ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 20 (476) | Чацвер, 11 ліпеня 1940 года | Цана 20 кап.

УРАЧЫСТАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Прыгожыя песні, неўміручыя легенды, помнікі героям на бязмежных дарогах, на шырокіх плошчах пакінула гісторыя... І кожны след гісторыі гаворыць аб героіцы народных спраў: аб барацьбе вялікага беларускага народа супроць царскіх апрычнікаў, супроць інтэрвенцкіх банд, супроць адвечных сваіх ворагаў-прыгнятальнікаў — польскіх паноў; аб братняй еднасці рускіх, беларусаў, украінцаў — еднасці, забяспечыўшай перамогу; аб мужнасці і свабодалюб'і беларускага народа.

Адной з ярчэйшых дат у гісторыі нашага народа застаўся дзень 11 ліпеня 1920 года, — дзень вызвалення беларускай сталіцы Мінска ад белапольскіх акупантаў. Гэты дзень для беларускага народа стаў нацыянальным святам вызвалення з-пад нянавіснага іга, ачышчэння роднай зямлі ад банд белапанскай Польшчы.

XX гадавіну вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў святкуе наш народ сёння. І святкуе гэтую гадавіну з асаблівай радасцю, бо назаўсёды змецена ўся белапанская поскудзь з нашай зямлі, бо народ наш з'еднан у адзінай вольнай, шчаслівай сям'і.

Святкуе народ. І думкі свае, гарачыя словы любві і ўдзячнасці накіроўвае ён да мудрай партыі большэвікоў, да лепшага друга свайго, бацькі і настаўніка — вялікага Сталіна.

Партыя Леніна — Сталіна, правадыр народаў таварыш Сталін арганізавалі, узгадавалі, умацавалі Совецкую Беларусь, далі шчаслівае жыццё беларускаму народу.

Ленін і Сталін у снежні 1918 года ўзнялі пытанне аб стварэнні Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Таварыш Сталін асабіста кіраваў справай стварэння Совецкай Беларусі, ён адрэдагаваў і маніфест аб абвяшчэнні БССР.

Ленін і Сталін арганізавалі гераічную абарону БССР у 1919 годзе ад інтэрвенцкіх полчышчаў Антанты, ад белапольскіх акупантаў.

Таварыш Сталін узначаліў кіраўніцтва баявымі аперацыямі па разгрому белапалякаў, выпрацаваў стратэгічны план, які і быў бліскуча ажыццёўлен Серго Орджанікідзе, павёўшым чырвоныя войскі на штурм ворага і спыніўшым на рубяжы р. Бярэзіны наступленне белапалякаў.

Ленін і Сталін, іх саратнікі — Орджанікідзе, Свердлаў, Фрунзе, Кагановіч, Калінін прыйшлі на дапамогу беларускаму народу, каб дапамагчы яму разграміць ворага, абараніць сваю маладую совецкую рэспубліку.

На заклік партыі горача адгукнуўся беларускі народ. Грознымі сталі для ворага беларускія лясы, балоты. Яны таілі мужныя партызанскія атрады. Народ-герой узняўся на дапамогу сваёй роднай Чырвонай Арміі.

Новы паход арганізавалі англа-французскія капіталісты супроць Совецкай Расіі ў 1920 годзе, накіраваўшы супроць яе сілы панскай Польшчы і барона Врангеля.

На Заходні фронт, на дапамогу беларускаму народу прыйшлі рабочыя Петраграда, Масквы і іншых гарадоў Совецкай Расіі, прыйшлі лепшыя сыны партыі і комсамола.

Таварыш Сталін, зноў, як у кожны крытычны момант грамадзянскай вайны, прыбыў на фронт для арганізацыі канчатковага разгрому белапалякаў.

Пайшла ў свой славуты рэйд Першая конная армія пад вадзіцельствам Варашылава і Будзённага. Беларускія партызаны руйнавалі тылы ворага.

Сакрушальны ўдар Чырвонай Арміі, горача падтрыманай народам, канчаткова разбіў планы Антанты, прымусіў белапалякаў уцякаць у паніцы.

11 ліпеня працоўны Мінск вітаў сваю вызваліцельніцу — Чырвоную Армію. І дэкларацыяй ад 31 ліпеня была адноўлена незалежная Совецкая Беларусь. Але з-за здрадніцкай дзейнасці Іуды Троцкага і іншых наймітаў міжнароднага капітала заходняя частка Беларусі засталася пад уладай акупантаў і 19 год цярпела ўціск і здзекі польскіх паноў.

Сёнешні дзень, дзень XX-годдзя вызвалення ад белапольскай акупацыі, беларускі народ адзначае з'еднанай сям'ёй пасля канчатковай расплаты з адвечнымі ворагамі — польскімі панамі.

Дзесяцімільённы беларускі народ разам з усімі народамі братніх совецкіх рэспублік пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, вялікага Сталіна пабеданосна ідзе па сонечнаму шляху комунізма.

Гераічныя справы народа, прыклады яго барацьбы і вобразы яго лепшых сыноў з'яўляюцца магутнай і невычарпальнай крыніцай творчага ўзбагачэння мастацтва, літаратуры. Песні і легенды, сказы і гумарэскі складае народ, адлюстроўваючы ўласнай творчасцю сваю сілу, мужнасць, гатоўнасць да абароны здабытага шчасця. Гераічнае мінулае народа, яго барацьба нараджаюць усё новыя і новыя таленавітыя творы ў нашай літаратуры, у нашым мастацтве.


Прыгадаем толькі некалькі твораў апошняга года. З'явілася драма «Над Бярозай-ракой» П. Глебкі, дзе паказаны ярчэйшыя прыклады барацьбы беларускага народа з белапольскімі акупантамі, дзейнасць сталінскага камісара Серго Орджанікідзе, арганізатара перамог Чырвонай Арміі на Заходнім фронце. Пастаноўка гэтай п'есы Віцебскім тэатрам дала магчымасць узбагаціць наша тэатральнае мастацтва стварэннем вобраза Орджанікідзе. Затым опера «У пушчах Палесся» А. Багатырова, дзе дадзен шырокі малюнак мужнасці беларускіх партызанаў. Раман М. Пасляdовіча «Паўстанне». Апавяданні Ю. Віцьбіча...

Выдатнейшая работа па распрацоўцы тэм, звязаных з вызваленнем Беларусі ад белапалякаў, са стварэннем БССР і адлюстраваннем у гэтым ролі Леніна і Сталіна, праведзена беларускімі мастакамі, якія падрыхтавалі выстаўку «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Створаныя для гэтай выстаўкі работы жывапісцамі Е. Зайцавым, М. Манасзонам, Н. Пашкевічам, скульптарамі З. Азгурам, А. Грубэ, А. Бразэрам і іншымі — сведчаць не толькі аб таленце аўтараў, але з'яўляюцца каштоўнейшым укладам у мастацтва нашай соцыялістычнай радзімы.

Гісторыя народа, яго нязломны гераічны дух, яго подвігі былі і будуць крыніцамі творчага натхнення майстроў літаратуры і ўсіх галін мастацтваў.

Соцыялістычная радзіма стварыла цудоўныя ўмовы для плённай творчай працы совецкіх літаратараў, работнікаў мастацтваў БССР. Яны акружаны вялікай любоўю народа, бацькоўскімі клопатамі партыі, таварыша Сталіна. Найярчэйшым сведчаннем гэтых клопатаў аб нашым мастацтве з'яўляецца высокае ўзнагароджанне ордэнамі СССР дзяржаўных тэатраў БССР — Опернага і Драматычнага, Філармоніі, узнагароджанне ордэнамі і медалямі лепшых майстроў мастацтваў — актораў, кампазітараў, мастакоў, паданне раду творчых работнікаў мастацтваў пачотных званняў. Гэтыя клопаты партыі і ўрада аб мастацтве, вялікае прызнанне і ўзнагарода абавязваюць працаваць яшчэ з большым уздымам, змагацца за новыя бліскучыя поспехі беларускага мастацтва, каб даць творы, вартыя велічы гераічных спраў нашага народа, нашай эпохі.

XX гадавіна вызвалення Беларусі ад белапольскай акупацыі — радаснае народнае свята. І гэта — дзень мабілізацыі мас на далейшае ўмацаванне магутнасці нашай радзімы і баявой гатоўнасці да абароны яе.



«Таварышы І. В. Сталін і Г. К. Орджанікідзе ў Рэўваенсовеце Заходняга фронта ў 1919 годзе». Скульптура А. П. Арлова.

Фота І. Каплінскага.

Павел Прануза

ПАСЛЯ ДАЖДЖУ

Заглухнуў гром. Густое выпарэнне,
Туман ўздымаецца з прамочаных лугоў.
Зеленаватая, з ружовым акаймленнем,
Вісіць вясёлка казачнай дугой.
Руччы бубняць сварлівыя і гоняць
У рэчку сугрунём карычневую муць.
Язі лянівыя, ляшчы шырэй далоні
Да берагоў, спажывы поўных, мкнуць.
Абмокшы дзяцел на сасне старанна
Доўгую дзюбу чысціць аб кару.

У прысадах смех задорны, нестрыманы,
І гальштукі гараць, што квецень руж.
То побач з піонерскім клубам,
Дзе шэрачэзны ад дажджу разліў,
Вясёлыя папаніцы, калумбы
Пускаюць самаробкі-караблі.
З-за рэчкі гай адлікваецца дроздам —
Гарлатым, неўгамонным песняром.
І вераб'і нахохленыя з гнёздаў
Вырыхваюць, як пчол руплівы рой.

А. Астрэйка

КВЕЦЕНЬ

I

Плыве ад жыта жоўты дым,
Яго хвалюе вецер.
Куды ні глянь, ляжаць сляды
Твае, чароўны квецень.
Жаўцеюць яблыкі ў садах,
Аж гнецца к долу веццe,
Ідзе шматфарбны па палях
Маёй радзімы квецень.
Калі-ж абрус пасцеле снег
Усцяж па ўсёй планеце,
Нібы ў чаромху па вясне
Мой край пабеліць квецень.
Люблю сваю зямлю, свой край
Мацней за ўсё на свеце.
І лістапад і месяц май
Я называю — квецень.

II

У зелень апрануўся сад,
А ў садзе яркі квецень мая.
Пайшло ўжо сонца на закат
І вецер белы пыл гушкае.
Ды з цяжару вясняных рос
Упалі матылём пялёсткі,
А вецер языком іх шорсткім
Злізаў і вуліцай панёс.
Панёс. На грушах дым пагас.
І завязь стыне ў лісці шэрым.
Яна пад старадаўні спас
Саспее жоўтай слуцкай бэрай.



«Уцяканне белапалякаў з Мінска ў 1920 годзе». Карціна Б. Каплана.

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

ПАД СОНЦАМ СТАЛІНСКІХ КЛОПАТАЎ

УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА ДЗІЦЯЧАЙ ТВОРЧАСЦІ

«Мастацтва ёсць узнаўленне рэчаіснасці; паўтораны, як-бы нанава створаны свет» (Белінскі).

Такім незвычайна яркім узнаўленнем рэчаіснасці, адлюстраваннем шчаслівага свабоднага жыцця і цудоўнага росквіту народных талентаў з'явілася Першая Усебеларуская алімпіяда дзіцячай творчасці.

Прадстаўленая дзесяццю абласцямі рэспублікі, палова якіх стала свабоднымі толькі з восені мінулага года, алімпіяда з'явілася вялікай падзеяй не толькі ў жыцці дзяцей, але і ў жыцці ўсяго беларускага народа.

Прайшоўшая алімпіяда мела некалькі станоўчых асаблівасцей.

Першая—незвычайная шырыня ахопу ўсіх відаў мастацтваў. Тут былі прадстаўлены харавыя гурткі, ансамблі песні і пляскі, мастацкая дэкламацыя і чытанне, балетныя калектывы, акрабатычныя групы, аркестры народных інструментаў, фізкультурныя групы, сольныя нумары, уласная творчасць, інсцэніроўкі і пастаноўкі цэлых п'ес.

Другая—незвычайная абшырнасць рэпертуару. Выконваліся самыя рознастайныя рэчы: народныя беларускія песні і пляскі, рускія, украінскія, каўказскія, польскія, цыганскія, малдаўскія танцы і песні. Выконваўся класічны рэпертуар: Чайкоўскі, Бізэ, Вердзі. Выконваліся песні і творы сучасных кампазітараў, паэтаў, пісьменнікаў. Шырока была прадстаўлена ўласная творчасць дзяцей: музыкальныя творы, вершы.

І трэцяя асаблівасць — гэта высокае мастацкае выкананне як цэлых калектываў, так і асобных выканаўцаў. Седзячы ў зале, не перастаеш захапляцца, атрымліваеш вялікую эстэтычную асалоду.

На сцэне хор мінскага Палаца піонераў. Гэта вельмі прыгожае відовішча. Размясціўшыся паўкругам, стаяць радамі хлопчыкі і дзяўчаты. Усе ў белых блузках і рубашках з чырвонымі гальштукамі. Кіраўнік хора — заслужаны артыст БССР С. Палонскі. Маладыя гучныя дзіцячыя галасы вельмі згуртавана і з вялікім уздымам выконваюць песню кампазітара Палонскага «Падзяка Сталіну».

Так адкрылася алімпіяда.

Хор добра выканаў і рускую народную песню «Мяцеліца». Далей перад вачыма гледача, як у калейдаскопе, змяняюцца адны выканаўцы другімі.

Інструментальная група Мінскай музычнай школы пад кіраваннем заслужанага артыста БССР А. Бяссмертнага вельмі добра сыграна, яна выканала твор кампазітара Аладава «Рандо».

На сцэне раптам паяўляецца вялікая віяланчэль, а за ёю лезвь віднацца маленькага хлопчыка, — гэта Паўлік Салодчанка. Ён з незвычайна сур'ёзным выглядам садзіцца на стул і выконвае твор Гольтэрмана, па назве вельмі блізкі яго сэрцу, — эцюд «Капрыз».

Але буру апладысментаў выклікала зусім маленькая дзяўчынка, Ната Фаміна, вучаніца Мінскай музычнай школы. Яна выйшла на сцэну і доўга ўстанаўлівала стул, які быў для яе завельмі высокім. Ната вельмі свабодна, лёгка выканала рэч Клумава «Рандо» і сыграла прыемны, свой уласны, твор «Летні дзень».

Вялікі поспех меў танцавальны калектыў мінскага Палаца піонераў, кіруемы ордэнаносцам К. Алексютовічам, які выканаў беларускі народны танец «Лявоніха». Гэта было вельмі весела, бадзёра. Адчувалася вялікая работа, праробленая калектывам і кіраўніком. Лёгкасць і чоткасць даюцца толькі пасля інтэнсіўнай і вялікай працы. Вельмі натуральна і прачута прачытала маналог Харкова «Земляніка» Жэня Булыгіна.

Другой областцю, выступіўшай на алімпіядзе, была Баранавіцкая. Столькі год знаходзячыся пад ігам паноў і памешчыкаў і не маючы магчымасці паказаць і праявіць свае таленты, народ, адароны па сваёй прыродзе, хаваў іх глыбока ў сваіх нетрах, чакаў больш шчаслівых часоў, і вось гэтыя часы наступілі. Радасць вызвалення, наступіўшае новае жыццё ўзнялo дух працоўных заходніх абласцей, які, натуральна, перш за ўсё выразіўся ў незвычайным уздыме і росквіце народнай творчасці, у самадзейнасці.

Ва ўсім, што было паказана на алімпіядзе вучнямі школ заходніх абласцей, адчувалася бурнае веянне новага жыцця. І пры ўсім гэтым — незвычайны энтузіязм, незвычайны ўздым пры выкананні!

Хор 12-й рускай школы гор. Баранавіч пад кіраваннем Ф. Лондан вельмі добра, згуртавана, з высокай культурай выканаў некалькі песень совецкіх кампазітараў: Александрава — «Гімн партыі большэвікоў», Дзержынскага — «Ад края і да края» і інш. і адразу-ж атрымаў прызнанне і адабрэнне ўсёй залы. Выступленне гэтага хора служыла як-бы агульным тонам для ўсіх наступных выступленняў.

Вельмі лёгка, здаецца, зусім не кранаючыся падлогі, выканала польку вучаніца 4 класа 1-й школы гор. Слоніма Вера Пыцель. Займальна пабудаваў мантаж «Вясёлае» калектыў 8-й яўрэйскай школы гор. Ліды.

Добра іграў на акардэоне Каплапскі, вучань 7 класа 1-й школы гор. Шчучына. Вучаніца 4 класа 7-й школы г. Ліды Ражанская з пачуццём прадэкламіравала «Хлопчык і лётчык» Янкі Купалы і «Мой унучак» Квітко.

Удзельнікі алімпіяды ад Вілейскай вобласці — вучні Смаргонскай школы нядрэнна паставілі оперу Манюшкі «Лялькі». Вучань 2 класа гэтай школы Маўберг вельмі лёгка выканаў цыганскі танец. Хор Куранецкага раёна добра выканаў «Песню аб Сталіне» Рэвуцкага і інш.

Пінская вобласць паказала досыць рознастайную праграму. Хор, танцы, мастацкая дэкламацыя, сольныя спевы, фізкультурныя нумары... Асаблівы поспех мелі вучні 4-й школы гор. Пінска, якім кіруе вучаніца Махля Мішэль. Яны выканалі добра апрацаваны фізкультурны танец. Два маленькіх хлопчыкі, вучні падрыхтоўчага класа з Ганцавіцкага раёна, Сава Зялёнка і Валодзя Цыган з вялікім поспехам выканалі ўкраінскі гапак. Хор Лёвінскай сярэдняй школы з поспехам выканаў некалькі песень: «Песню аб Сталіне», беларускую народную «Ой, у лузе, лузе», грузінскую народную «Суліко» і інш.

Беласток танцуе. Так можна выразіць асноўнае ўражанне ад паказу дзіцячай творчасці Беластоцкай вобласці. З густам аформленыя танцавальныя калектывы пакідаюць добрае ўражанне. Цікавы вальс з гірляндамі ў выкананні вучняў балетнай школы пад кіраваннем тав. Бекер. Добра, весела выконваецца папуры народных танцаў калектывам 13-й школы гор. Беластока. Удала прачытала вучаніца 1 класа 9-й школы гор. Гродна Маша Стан верш «Як Ляля збіралася ў Маскву». Вялікім поспехам у гледача карыстаўся жартаўлівы танец у выкананні калектыва 28-й школы гор. Беластока пад кіраваннем Дамарацкага.

Брэсцкая вобласць пакінула ў гледача таксама добрае ўражанне. Добра аформленыя дэкарацыі, на фоне якіх адбываліся выступленні, узмацнялі агульнае прыемнае ўражанне. Надоўга запомніліся выступаўшыя дзве сястры 6-ці і 8-мі год Марыя і Надзя Мышленюк. Яны з вялікай сур'ёзнасцю выканалі дзве народныя ўкраінскія песні — «Распрагайце, хлопцы, коні» і «Чым трава зелена». Вялікі поспех меў Жэня Сувалаў, які выканаў парадыйную песню «Тучы над дотамі сталі».

Рознастайную праграму паказала Магілеўская вобласць. Станоўчы бок яе выступлення — багацце класічнага рэпертуару. Аркестр народных інструментаў магілеўскага Дома піонераў пад кіраваннем В. Дзедзіолы паказаў добрую сыгранасць і тэхніку выканання. Асабліва ўдала атрымліваецца ў яго «Кітайская серэнада» Сідэ. Нядрэнна паставілі выхаванцы 7-га дзіцячага дома оперу Венберга «Гусі-лебедзі» (пастаноўка Палуянава). Танцавальная група Дома піонераў пад кіраваннем Палуянава нядрэнна выканала кітайскі танец з балета «Шчаўкунчык», беларускі народны танец «Мікіта» і інш.

Першым ад Гомельскай вобласці выступіў танцавальны калектыў клуба імя Леніна. Пляска «Чыгуначнікі» выклікала буру апладысментаў. Незвычайная апрацаванасць, майстэрства ўсяго калектыва ў цэлым, а таксама яго асобных удзельнікаў выклікала захапленне гледачоў.

Палеская вобласць таксама паказала многа добрых нумараў, але асаблівае ўражанне пакінуў танцавальны калектыў 2-й сталінскай школы гор. Мазыра пад кіраваннем вучня 6 класа Люсіка Багданава. Калектыў чотка, у тэмпе выканаў беларускі народны танец «Мікіта», украінскую пляску і «Лявоніху». Вучань з Брагінскага раёна Міша Палкоўскі вельмі добра прачытаў апавяданне «Пагранічнік».

Рознастайныя нумары паказала Віцебская вобласць. Аркестр народных інструментаў 2-й сярэдняй школы гор. Полацка пад кіраваннем настаўніка Шалаева выканаў рад песень і уверцюру да оперы «Кармэн» Бізэ.

Падводзячы вынікі багатым уражанням ад паказу дзіцячай творчасці на Першай Усебеларускай алімпіядзе, захапляешся рознастайнасцю і багаццем талентаў, якія нараджаюцца беларускім свабодным народам. І міжволі ўспамінаюцца словы тав. Жданава, сказаныя ім аб совецкіх дзецях:

«Нібы кветкі цудоўнага саду расцвітаюць здольнасці і таленты рэбят пад сонцам сталінскіх клопатаў».

Валенцін ЗУБ.

ПАКАЛЕННЕ ШЧАСЛІВЫХ

У зале, сярод шматлікай публікі, сядзела пажылая ўжо, добра вядомая заслужаная артыстка і не адрывала вачэй ад сцэны.

... У чыгуначнай будцы, якая стаяла каля зялёнага сасновага лесу, за паламаным столікам, ля асколка ўпрыгожанага люстра яна любіла прадстаўляць перажыванні герояў з прачытаных кніг. У бацькі быў брат у горадзе — важны швейцар тэатра, які горда хадзіў у сваёй расшытай пазументамі ліўрэі. Яму напісалі. Ён злітаваўся над пляменніцай і забраў яе к сабе ў горад. Але і пасля гэтага мінулі годы, пакуль пачалася тэатральная біяграфія дачкі чыгуначнага вартаўніка...

Чамусьці цяпер, з хваляваннем сочачы за сцэнай, дзе выступалі дзеці, ёй ясна ўспаміналася пражытае.

— Добра, што яны растуць у іншым акружэнні, пад іншым сонцам, клапатлівым і ласкавым, — падумала, яна.

Не артыстаў, не штосьці закончанае, дасканалае бачыла артыстка на сцэне. Для яе, бывалага ў мастацтве чалавека, яны заставаліся дзецьмі, і гэта ўменне трымаць сябе перад публікай, веданне сутнасці выконваемых песень і плясак яна тлумачыла, і тлумачыла правільна, цудоўнай выхаваўчай сілай совецкай школы, якая прывівае сваім выхаванцам любоў да мастацтва, да творчасці, да паэзіі.

Справа не ў тым, выйдуць з іх артысты ці не выйдуць, — з многіх, вядома, выйдуць, — але мастацтва яны будуць разумець і любіць — доўга, заўсёды, усё жыццё.

На мінуту загарнулася заслона і потым зноў плаўна разышлася па баках.

Юныя чыгуначнікі! Дзіцячы танцавальны ансамбль гомельскага клуба чыгуначнікаў.

На сцэну выпырхнулі 30 рэбят. Дзеці машыністаў, пуцявых абходчыкаў, стрэлачнікаў, кандуктараў, дзяжурных па станцыі.

У выдатна распрацаваным сюжэтным танцы «Чыгуначнікі» (пастаноўка тав. Рыбальчанкі) артыстка ўбачыла блізкае, знаёмае ёй з маленства. Паравоз, з саставам вагонаў ззаду, рыхтуецца да адпраўкі. Дзеці, якія любяць чыгунку, нават у танцы змаглі вельмі ўдала падкрэсліць сваё захапленне тэхнікай. Поезд аглядаюць... Ну, усё ў парадку! Начальнік, давай свісток. Загудзеў паравоз, узлыхнуў парам і рытмічна застукаў коламі.

Своеасаблівасць трактоўкі любой выконваемай пляскі — добрая ўласцівасць юных плясуноў-чыгуначнікаў, і ў гэтым вялікая заслуга пастаноўшчыка. Ён пазбягае паўтораў, не капіруе вялікія ансамблі, дарослых танцораў,—у дзіцячай пляцы ён пакідае самабытнасць, так характэрную для рэбят, не затушоўвае тыя рысачкі, якія рысуюць дзіцячую псіхалогію, любоў нашых рэбят да Чырвонай Арміі (пляска чырвонаармейская).

Першая рэспубліканская алімпіяда дзіцячай творчасці гэта, перш за ўсё, алімпіяда калектываў, і гэтым тлумачыцца вялікі поспех масавых выступленняў—хораў, плясак, драматычных пастановак. Дзеці вучацца тварыць у калектыве. Выхаваўчую сілу калектыва выдатна адлюстравала алімпіяда.

У польскіх гімназіях дзяцей імкнуліся раз'еднаць, на службу гэтай мэце прыходзіў ксёндз са сваімі «таінствамі». Совецкая школа з карэннем вырывае гімназічныя перажыткі, і велізарнае выхаваўчае значэнне калектыва ўжо зараз дало бліскучыя рэзультаты. На алімпіядзе выступалі з песнямі і пляскамі баранавіцкія школьнікі (іх трэба адзначыць у першую чаргу), брэсцкія, беластоцкія, пінскія. Пазнайце ў гэтых рэбятах учарашніх дзяцей вуліцы, каму было недаступна вучыцца, гаварыць на роднай мове!.. Зараз яны горда разам з бацькамі і маці рамі заспявалі песню ва славу сваёй радзімы.

Е. САДОЎСКІ.



Работнікі мастацтваў БССР, указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 20 чэрвеня 1940 года ўзнагароджаныя ордэнамі і медалямі СССР. Першы рад (злева направа): узнагароджаныя ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга А. Д. Арсенка, А. В. Багатыроў, М. І. Дзянісаў, П. І. Засецкі, В. Ф. Лапін, Р. В. Млодэк, Е. К. Цікоцкі, І. Ю. Шлепянаў; узнагароджаныя ордэнам «Знак Почета» Ц. Н. Сяргейчык, Н. Н. Чуркін, другі рад: М. Э. Шпейдэрман, М. А. Зораў, Н. Н. Шчэглоў; узнагароджаныя медаллю «За трудовое отличие» А. А. Астрамецкі, А. Я. Баранава, І. Г. Бары, Е. С. Безбародава, А. Г. Гайдарын, Н. Б. Грубін (раней узнагароджаны ордэнам «Знак Почета»), І. Ф. Гурэцкі.

Фота І. Каплінскага.

ДРАМАТУРГІЯ К. КРАПІВЫ

Ю. ДВОРКІНА

Імя Кандрата Крапівы атрымала на Беларусі шырокую вядомасць яшчэ з 1923—24 год. У беларускую літаратуру пісьменнік увайшоў байкапісцам, сатырыкам, які біў па адмоўных традыцыях старога свету, смехам сваім дапамагаў выкарчоўваць перажыткі мінулага. Доўгі час байкі і сатыры былі пераважаючым жанрам у яго творчасці.

Пачынаючы з 1934 года, К. Крапіва пераходзіць да новых жанраў, у прыватнасці, да драматургіі, раскрыўшы такім чынам яшчэ адну асаблівасць свайго таленту. Беларускі чытач ведаў К. Крапіву — сатырыка, майстра дасціпных жартаў і насмешкі. У «Партызанах», а часткова ўжо ў першай сваёй п'есе «Канец дружбы» К. Крапіва паказаў, што ў ім ёсць і глыбокі лірызм, любоў да людзей, ёсць і ўменне паказаць высокі гераізм чалавека, яго лепшыя якасці, як адданасць вялікай справе комунізма, мужнасць, пачуццё дружбы, гатоўнасць змагацца да канца за шчасце працоўных.

У п'есе «Канец дружбы» К. Крапіва паставіў тэму аб аснове дружбы, гэтага аднаго з прыгажэйшых і гуманістычных чалавечых пачуццяў. Усім ходам развіцця сюжэта К. Крапіва паказаў, што дружба грунтуецца на прынцыповасці, супольнасці класавых інтарэсаў, на адданасці адной і той-жа грамадскай справе. Паказ перараджэння Лютынскага са змагара ў часы грамадзянскай вайны ў ворага і пасобніка кулакоў у далейшым і паказ разрыву на гэтай глебе дружбы Карнейчыка з Лютынскім — вось вострая драматычны канфлікт твора. Вобраз Карнейчыка — адзін з першых станоўчых вобразаў у творчасці К. Крапівы.

П'еса «Партызаны» з'явілася паглыбленнем паказу станоўчых вобразаў непрыкметных, але гераічных людзей нашага часу, паказу маральных якасцей беларускага народа.

Галоўнае месца ў «Партызанах» драматург адвёў станоўчым народным героям, простым, але гераічным змагарам, гэткім, як Даніла Дрыль — кіраўнік партызанскага атрада, як яго маці і сястра, партызаны, дзед Бадыль, Настулька, прадстаўнікі Чырвонай Арміі, як Скіба-Кудзін. Вялікую ўвагу ў п'есе прыцягваюць вобразы дзеда Бадыля і бежанца Батуры. У абодвух ёсць агульныя якасці. Беларус Бадыль і паляк Батура—сыны працоўнага народа.

Асабліва ўдаўся пісьменніку вобраз дзеда Бадыля, які паказваецца, як носьбіт народнай мудрасці, аптымізму.

Мова Бадыля насычана афарызмамі, згусткамі яго жыццёвага вопыту, народнай мудрасці.

Паляк Батура дапаўняе дзеда Бадыля. Гэта майстар вясёлых жартаў, прыказак, прыпевак, з прыходам якога ажыўляюцца людзі. Батура выкарыстоўвае свае жарты для справы барацьбы. Вобраз Батуры падкрэслівае не толькі народныя пачуцці гневу да паноў, але і інтэрнацыянальную саліданасць працоўных.

Меней удаўся аўтару вобраз Данілы Дрыля, кіраўніка партызанскага атрада. Паказаўшы ў ім мужнасць, энергію, самаадданасць справе барацьбы, К. Крапіва не даў гэтым якасцям эмацыянальнага гучання. Таму так часта мова Данілы збіваецца на рыторыку.

Каларытна зроблены ў п'есе эпізадычныя вобразы маці Данілы, якая аддае сваё жыццё за сына, стаўшы перад стрэльбай жаўнера, Міхала і Халімона — вясёлых, жартаўлівых хлапцоў-партызанаў, Настулькі. К. Крапіва паказвае шырокі фон народнага жыцця. Па сутнасці, беларускі народ з'яўляецца галоўным героем п'есы.

Сярод вобразаў ворагаў лепш за ўсё ўдаліся драматургу Маргун, Шмігельскі і Кацярына. Калі вобраз Шмігельскага вытрыман у камедыйным плане, дык вобразы Маргуна і Кацярыны ўносяць у твор драматычную напружанасць.

Сцэна ў хаце Рыгора, дзе Кацярына ўгаварвае Рыгора здрадзіць Данілу, — адна з найбольш напружаных ва ўсёй п'есе. Вобраз Рыгора раскрываецца паступова ў яго супярэчнасцях і іх хістаннях. Драматычная напружанасць узнікае таму, што глядач не ўпэўнен у тым шляху, які выбярэ Рыгор. Па-майстэрску паказаў К. Крапіва барацьбу пачуццяў Рыгора, его хістанні паміж каханнем і дружбай, уласніцкімі імкненнямі і благародствам. Тое, што ў класічнай французскай трагедыі насіла абстрактны характар, — канфлікт паміж маральным абавязкам і каханнем, — увасабляецца К. Крапівой у канкрэтных фактах класавай барацьбы. Аддаць перавагу каханню — значыць, здрадзіць усяму працоўнаму народу, дапамагчы панам-крывапійцам і надалей прадаўжаць свае здзекі над народам. І з якой палёгкай успрымае глядач забойства Кацярыны! Іменна гэта сцэна ўносіць у п'есу драматычны элемент, інакш-бы п'еса больш нагадвала паасобныя народныя сцэны, накшталт «Жакерыі» Мерымэ.

Драматычна-напружаным з'яўляецца яшчэ адзін эпізод у п'есе, прасякнуты лірычнасцю і эмацыянальнасцю. Гэта — сцэна, у якой сяляне напружана чакаюць весткі аб вызваленні палонных партызанаў і, урэшце, даведваюцца аб іх расстрэле.

У п'есе вельмі ўдала спалучаюцца, такім чынам, трагічныя і камічныя элементы, але камедыйных характараў, за выключэннем Шмігельскага, тут няма. Камізмам прасякнута сцэна сватаўства Скібы, бо тут пісьменнік ужывае такі камедыйны прыём, калі адзін персанаж гаворыць адно, а другі разумее іншае. Асноўны тон жартаўлівых сцэн—мяккі гумар пісьменніка і яго любімых станоўчых герояў. Вялікая колькасць фальклорнага элементу (прыказкі, пагаворкі, жарты, народныя спевы, абрады) асабліва адцяняе прыгожую сутнасць галоўнага героя п'есы — беларускага працоўнага народа.

П'еса «Партызаны» сведчыць аб тым, што для аўтара зусім рэальным і блізкім з'яўляецца вобраз станоўчага героя нашых дзён, змагара за лепшую будучыню, чалавека, які можа служыць узорам для чытача ці гледача (Карнейчык — «Канец дружбы», Даніла Дрыль, дзед Бадыль — «Партызаны»). Іменна таму, што пісьменнік мае вопыт стварэння станоўчага героя, яму ўдалося стварыць моцную сатырычную камедыю «Хто смяецца апошнім», камедыю выкрываючую, у якой бліскуча асмеяны тыя, хто імкнецца пад выглядам совецкага чалавека рабіць брудныя справы, выкарыстоўваць павагу да чэснага, гераічнага чалавека нашых дзён у мэтах кар'еры, у мэтах злачынства.

К. Крапіва выкрывае такіх тыпаў ад імя чэсных людзей совецкай рэчаіснасці, ён змагаецца ў імя адданых сыноў радзімы супроць розных Гарлахвацкіх, Зёлкіных, ён дапамагае сваёй сатырай перавыхаванню Туляг.

Камедыя «Хто смяецца апошнім» мае ў сабе адзнакі выкрываўчай камедыі нраваў, у якой спалучаецца і сарказм, накіраваны супроць ворага, і элемент самаасмяяння, калі чалавек нашых дзён перамагае ў сабе адмоўныя якасці, не сумяшчальныя з гонарам совецкага чалавека, і тым самым падымаецца да новых форм свядомасці. Тут ёсць і вясёлы, бадзёры смех чэсных совецкіх людзей, якім давялося перажыць непрыемныя хвіліны, але якія моцна вераць у сваю перамогу і выходзяць пераможцамі з барацьбы.

Совецкая камедыя павінна быць зброяй у барацьбе з ворагамі соцыялістычнай радзімы. Але яна, разам з тым, павінна з'яўляцца і сродкам крытыкі нашых недахопаў. Сфера яе ўздзельнічання і сродкі яе ўздзейнічання — вельмі шырокія і рознастайныя.

Мы бачым, што ў камедыі К. Крапівы спалучаюцца гэтыя два моманты: выкрыццё ворага і перавыхаванне совецкага чалавека.

Камедыя «Хто смяецца апошнім», у асноўным, з'яўляецца камедыяй характараў. Паказ камедыйных характараў заўсёды цікавіў тэарэтыкаў літаратуры. Справа ў тым, што камедыйным характарам часта пагражае небяспека перитварыцца ў чыста забаўляючыя, а іншы раз і ў пошла-бытавыя вобразы. Аб гэтым перасцерагаў Белінскі, які пісаў аб выкананні геніяльным Шчэпкіным ролі гараднічага ў «Рэвізоры»: «Абодва яны не хочуць рабіць ні карыкатуры, ні сатыры, ні нават эпіграмы, але хочуць паказаць з'яву сапраўднага жыцця, з'яву характэрную, тыповую».

Тыповым вобразам ворага, хітрага драпежніка, які імкнецца перашкодзіць соцыялістычнаму будаўніцтву, і з'яўляецца ў камедыі Гарлахвацкі, трацкіст і шкоднік, які прабраўся на пасаду дырэктара навуковай установы, каб тут пакуль-што замесці сляды сваёй шкодніцкай дзейнасці ў наркамаце.

Сам па сабе Гарлахвацкі не з'яўляецца выключна камедыйным характарам. Камедыйным ён з'яўляецца таму, што аўтар ставіць яго ў такія палажэнні, у якіх ён не можа не выклікаць смеху, бо глядач ці чытач адчувае яго нядоўгавечнасць, бачыць, што ўсе яго спробы адстаяць сябе ўсякімі бруднымі сродкамі — безнадзейны. Добра смяецца той, хто смяецца апошнім, — вось асноўная думка аўтара. Урэшце, гэты выкрыты, разбіты вораг уяўляе сабою жалкае, камічнае відовішча, і глядач далучаецца да вясёлага, жыццёрадаснага смеху чэсных совецкіх людзей, якія выйшлі пераможцамі з барацьбы і не могуць не смяяцца над Гарлахвацкім, над «свінтусам грандыёзусам». Дабіты вораг ужо не страшны, вось чаму гучыць гэты смех.

Але зусім праў К. Крапіва, калі ён надае Гарлахвацкаму ў пачатку п'есы больш сур'ёзны і іншы раз драматычны характар. Дзейнасць Гарлахвацкіх выклікае смех толькі тады, калі яны разгромлены. Калі такія Гарлахвацкія ганьбуюць чэсных людзей, накшталт Чарнавуса, калі яны імкнуцца выкарыстаць баязлівасць Туляг, запалохаць іх, каб вылезці ў навуковыя працаўнікі, калі такія людзі, як Зёлкін, распаўсюджваюць правакацыйныя чуткі аб Чарнавусу, — гэта не смешна, гэта стварае нават драматычную напружанасць, пры ўсёй камічнасці вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. У гэтым — дадатны бок камедыі, што сарказм, гнеўная сатыра знаходзяць свё месца ў творы, што праз камічную вонкавасць выступае грамадская шкоднасць пэўнага характару, яго варожасць соцыялістычнай рэчаіснасці, новым, соцыялістычным адносінам людзей.

Такім чынам, галоўныя характары камедыі паказаны пісьменнікам не толькі вонкава. Ён ускрывае корні адмоўных з'яў, ён паказвае класавых ворагаў, дзейнасць якіх носіць цалкам сур'ёзны, агідны характар. І толькі абяззброіўшы іх, пісьменнік з вышыні светапогляду совецкага чалавека смяецца над імі.

Туляга — совецкі вучоны, чэсны працаўнік, кваліфіцыраваны спецыяліст. Але ў ім ёсць перажыткі старых мяшчанскіх традыцый: палахлівасць перад начальствам, страх, каб яму не прыпісалі чужых грахоў, каб аб ім не падумалі чаго-небудзь дрэннага. У адносінах да Тулягі задачай аўтара з'яўлялася выпраўленне такіх, як ён, смехам. Смех над Тулягай мае глыбокае выхаваўчае значэнне. Ён як-бы перасцерагае гледача: «А ці няма ў вас маленечкай часткі Тулягі? Ці не было так, што вы, занадта паважаючы начальства, іншы раз заплюшчвалі вочы на яго амаральныя ўчынкі? Ці не праходзілі вы міма некаторых агідных з'яў, баючыся, каб «што-небудзь не выйшла»?» Такія пытанні выклікае вобраз Тулягі. І, смеючыся над ім, глядач як-бы ачышчаецца ад падобнага недахопу, пазбаўляецца ад яго. Туляга сам, у канцы канцоў, пад уплывам здаровага совецкага калектыва ўпэўніваецца ў тым, што яго паводзіны не адпавядалі яго становішчу совецкага вучонага. З канфлікту камедыі ён выходзіць абноўленым, узбагачаным вопытам, як-бы адкінуўшым ад сябе тое адмоўнае, што абумовіла яго падначаленне Гарлахвацкаму, набыўшым новыя, дадатныя якасці. Совецкая камедыя мае магчымасць паказваць і станоўчых людзей, сапраўдных людзей—носьбітаў лепшых якасцей чалавека эпохі соцыялізма. Не толькі сатыра і крытыка, але і пафас сцвярджэння новага чалавека ўласцівы совецкай камедыі ў адрозненне ад камедыі класічнай.

«Што карысці паразіць ганебнага і парочнага, выстаўляючы яго на паказ усім, калі няясен у табе самім ідэал яму процілеглага выдатнага чалавека?»—пісаў вялікі сатырык Гоголь. Гэта немагчымасць паказаць, у процівагу адмоўным героям камедыі, носьбітаў станоўчых якасцей характэрна для класічных камедый. У крайнім выпадку, камедыёграфы ў якасці станоўчых людзей выводзілі сухія, безжыццёвыя вобразы рэзанёраў, якія выказвалі свае погляды.

Совецкая камедыя мае вялікія магчымасці ў справе паказу станоўчага героя. Яны шырока выкарыстаны К. Крапівой. Вера, Чарнавус, Лявановіч, цёця Каця, Нічыпар—усё гэта жывыя людзі, якія актыўна дзейнічаюць у творы. Праўда, крыху рэзанёрства ёсць у вобразе Лявановіча, але ўсё-ж гэта жывы, актыўны чалавек. Паказ моцы здаровага совецкага калектыва, яго барацьбы за праўду, за зрыванне масак са шкоднікаў і паклёпнікаў—вось тое дадатнае, у імя якога выступае пісьменнік. Ён добра ведае, якім павінен быць, якім з'яўляецца чалавек нашай эпохі, і ў імя гуманізму соцыялістычнага грамадства, у імя чалавека нашай эпохі сатырычна смяецца над Гарлахвацкімі і Зёлкінымі, выклікае смех над Тулягай.

Драматургія К. Крапівы ўзбагаціла драматургію Совецкага Саюза. З'яўляючыся сведчаннем росту і росквіту беларускага мастацтва, соцыялістычнага па зместу і нацыянальнага па форме, яна сведчыць аб пачэсным месцы, якое займае беларускае мастацтва ў культуры ўсіх народаў нашай соцыялістычнай радзімы.

СВАЯ ХАТА

Урыўкі з рамана „Судны дзень“

КУЗЬМА ЧОРНЫ

З свайго ўцякацтва ад рэволюцыі Залеўскі вярнуўся ў Сумліцкі маёнтак на другі дзень пасля таго, як у мястэчка ўвайшло польскае войска. Усю зіму дзевятнаццатага года ён займаўся тым, што сыскваў з людзей усё, што паразбіралі ў рэволюцыю з маёнткаў і фальваркаў. Ён спаганяў за кожны высечаны ў яго лесе прут. Ведаючы яго маладыя годы і першыя часы пасля шлюбу з варшавянкай, магло-б думацца, што, нарэшце, ужо ён будзе мець спакой душы, бачачы, як Польшча ўстала з сваёй магілы. Аднакжа, усе бачылі яго заўсёды ў клопаце і суме. Як утрапёны, кідаўся ён з маёнтка ў маёнтак, з вёскі ў вёску, рабіў усё сам, сам заглядваў у сялянскія пуні, шукаючы свайго разабранага набытку. Здаецца, ён апрасціўся. Здаецца, нейкія адзнакі апусклівасці з'явіліся ў ім. Можа ён сапраўды так пачаў любіць гаспадарку, якую быў страціў і якую цяпер войска доўгачаканай Польшчы вярнула яму. Спрактыкаваная заўзятасць яго была цяпер не меншая, як у дзевяцьсот пятым годзе неспрактыкаваная злосць. З адных толькі Сумліч ён пасадзіў цяпер у астрог чалавек трыццаць. Цяпер ужо зусім было так, што гэты астрог быццам-бы яму і належаў. Расказвалі, што павятовае начальства, пад загадам якога была і турма, ніводнага важнага кроку не зрабіла, каб не параіцца з ім, а часам прасіла ў яго дазволу. Пад сярэдзіну зімы прайшла чутка, што ён збіраецца паставіць новую статую мадонны і ўжо ў самым мястэчку. Але пасля ён неяк раптам аціх, заўсёды стаў вельмі задуменны. Слугі расказвалі, што цяпер больш, як калі раней, ім апаноўваць пачалі, здавалася, беспрычынныя ўспышкі гневу. У адзін з такіх момантаў ён успомніў пра тыя свае «хаткі». Ён сам паехаў туды і не пазнаў гэтага кутка. На заходнім краі нераскарчаванага зарасніку, на яго зямлі, стаяла некалькі новых хат, такіх вялікіх і зграбных, што іх льга было назваць дамкамі. Ён увайшоў у першую з іх і ўбачыў там збянтэжаную постаць аднавокага чалавека, твар якога быў падобен да грымасы.

— Як ты завешся?—моцна запытаў Залеўскі.

— Рыгор Федаркевіч,—адказаў чалавек.

— Што-ж ты на маёй зямлі выбудаваўся?

— Карчуючы гэтую зямлю, я, паночку, страціў вока і ўсё сваё аблічча.

— А дрэва дзе браў?

— Не я адзін сек. Тады быў, паночку, такі закон. Што народ вінават!

— Такі быў закон?!—крыкнуў Залеўскі, і Рыгор Федаркевіч уныў душой.

Гэты чалавек у першыя дні рэволюцыі, перад яснымі перспектывамі ў сваім жыцці, больш як калі раней, адчуваў смутак ад свайго калецтва. Што-ж да Антона, то ён ужо не задумваўся над гэтым: думкамі нічога не паможаш. Ён быццам-бы змяніўся адразу, усё, што адбылося на свеце, напоўніла яго дзейнасцю. Ні аб якой мінуўшчыне ён ужо не думаў і, не гледзячы на сваю першую маладосць, раптам выявіў сябе вельмі сталым чалавекам. Ён гатоў быў стаць спрактыкаваным гаспадаром і рваўся да гэтага. У яго будзе зямля і хата, сапраўдная, вялікая, новая хата!

. . . .

Пакуль мясцовасць занялі немцы, Федаркевічава хата стаяла ўжо накрытая. Паміж адыходам немцаў і прыходам палякаў у ёй была пакладзена столь, падлога, устаўлены вокны і дзверы. Федаркевічы перабраліся ў яе і пажылі ў ёй два дні, пакуль прышлі палякі і з'явіўся Залеўскі.

За бацьку ўступіўся Антон, бачачы, ку ўступіўся Антон, праўдзіва бачачы, што калі раней бацька вытрымаў няшчасце, якое яго абязвечыла, то цяпер ужо не вытрымае збойства. Усё легла на галаву Антона. Залеўскі пакінуў гэтую хату, але застаўся аканом. Ён даў Федаркевічам пяць дзён, каб зусім пакінуць гэтае месца. За гэты час яны не паспелі выбрацца. Тады з'явіліся сумліцкія паліцыянты. Стары Федаркевіч схаваўся, а Антону здалося, што ён не можа пабыць адвакатам за бацьку. Яго кінулі вобземлю і збілі да крыві. Уночы ў яго пачала пухнуць нага і ён канчаўся з болю. З ранку літасцівы сусед павёз яго ў гарадскую больніцу. За месца ў больніцы трэба было заплаціць, і Рыгор Федаркевіч прадаў свой кажух, боты, і, можна сказаць, усё, што льга было прадаць. Пасля гэтага выбраўся з сваёй хаты некуды на людзі. Антон застаўся ляжаць у больніцы, а хата запуставала. Федаркевіч забіў у ёй вокны аполкамі, маючы цьмяную надзею, што калі-небудзь, можа, будзе што лепшае.

. . . .

Перад самым світаннем у гэты лясны закутак прышоў малады, высокі і плячысты хлопец. Ён мінуў масток над рачулкай, прайшоў кусты і ўвайшоў у рэдкі хвойнік. Ідучы, ён навакол азіраўся, да ўсяго прыслухоўваўся, нават магло здавацца, што ён вельмі нясмела ідзе тут. У нізкіх месцах стаяў туман і ўсё было так ціха, што дзіўна было падумаць, што менш поўсутак таму назад тут усё грымела і траслося і, абліваючыся крывёй, тут падалі і ўміралі людзі. Край неба запалавеў, змрок пачынаў сплываць. Хлопец узышоў на вышэйшае месца, стаў пад хвоямі і пачаў прыслухоўвацца, кудысьці перад сабою ўглядаючыся. Ноч яшчэ не дазваляла што-небудзь выразнае ўбачыць там. Толькі адтуль чутны былі галасы, крыкі, стук па дрэву. Калі-ні-калі мільгалі агні ліхтароў. Хлопец не ведаў, што там такое адбываецца і, прытуліўшыся да хвоі, чакаў. Як крыху павіднела і пачало ружавець неба, хто-б падышоў сюды, мог-бы добра ўжо разгледзець хлопца пад хвояй. Гэта быў высокі здаравяк, з тварам, чорным ад поту. Можа, ён нядаўна шпарка ішоў і спацеў. На нагах у яго былі вялікія зрыжэлыя боты з шырокімі і кароткімі халявамі. Старая жыкетка на ім з гаспадарскага сукна, кароткая, вышмарганая і зліняная, адлівала жоўтаватым колерам. З-пад яе ўнізе відна была палатняная непадперазаная рубашка.

Калі яшчэ больш павіднела, там, куды глядзеў хлопец і дзе канчаўся рэдкі ўзлесак, пачала вырысоўвацца ў бялявым змроку хата. Яна стаяла на ўзгорыстым прылесным полі і там відзён быў рух людзей. Хлопец чакаў яшчэ, пакуль лепш развіднее, каб убачыць, што там за людзі. Плынь паветра пайшла з захаду ў гэты бок і хлопец адчуў, як запахла дымам. Неба заружавела больш. На ядлоўцу паміж зялёных іголак ужо відны былі даўгаватыя кроплі расы. Дзве высокія хвоі стаялі над дробным зараснікам. Хлопец падняў твар угору. Вершаліны хвояў ужо ружавеліся ад сонца, якое было яшчэ дзесьці за даляглядам. Хлопец прыгледзеўся да хаты ў полі і твар яго праясніўся ўмомант: каля хаты былі людзі ў чырвонаармейскім адзенні, гэта відно ўжо было выразна. Хлопец рвануўся ісці туды, але вочы яго ўпалі на сцежку перад сабой і збоку яе ён убачыў штосьці падазронае. Пад кустамі было яшчэ змрочнавата, пры тым-жа ўсё, што магло ляжаць пад імі на зямлі, танула ў густым верасе. Хлопец падышоў бліжэй і ўбачыў некалькі трупаў польскіх салдатаў. Спачатку ён узды гануўся ад нечаканасці і спалоху, але пачуў з-пад хаты чырвонаармейскія галасы і пасмялеў. Ім апанавала ўзбуджанасць, але разам з тым ён меў выгляд чалавека, які ведаў, што так усё тут і павінна быць.

— Ого, гэта, мусіць, тут якраз і быў той учарашні бой,—прабубніў ён сам сабе пад нос, шпарка зрабіўшы ўжо крокаў пяць, каб хутчэй дабегчы да хаты. Але якраз на сцежцы, у яго пад нагамі, ляжала згамтаная ў кучу адзежа. Капнуўшы яе нагой і перавярнуўшы адзежу, ён убачыў на зялёным сурдуце афіцэрскія галуны і пагоны. І тут ён заўважыў, што адзін салдацкі труп раздзеты, у адной толькі бялізне.

— Ого, дык гэта афіцэр раздзеты! Хто-ж гэта яго, ці, можа, ён сам раздзеўся?—бубніў хлопец. На твары яго свіцілася цікаўнасць чалавека, у якога ўсё добра ідзе на свеце.

— А, можа, ён яшчэ жывы? Эй ты, пан! Абзавіся!

Раздзеты салдат перасмыкнуў тварам, і толькі ўсяго. Першыя праменні сонца кранулі яго. Хлопец убачыў, што з-пад расхрыстанай і паднятай на жываце кашулі відно пасінелае ад холаду цела.

— Ты жывы? Панская навалач, чаго цябе сюды чорт гнаў з гэтай тваёй Варшавы, хто цябе прасіў сюды, каб цябе халера?—бубніў хлопец і, падняўшы з зямлі афіцэрскую адзежу, пакрыў ёю раздзетага салдата.

Салдацкі твар застаўся нерухомы, хлопцу стала не па сабе—непрыемна і страшна аднаму сярод трупаў, і ён шпарка рушыў з гэтага месца. Ён ішоў падбегам і відно было, што ў гэтай шпаркай хадзе ён накульгвае на левую нагу, і чым шпарчэй ён ішоў, тым больш прыпадаў на гэтую нагу. З вачэй яго так і лілося радаснае святло.

— Ого, хата стаіць на месцы!—некалькі разоў прамармытаў ён, паглядаючы на чырвонаармейцаў, якія рухава клапаціліся каля новае хаты з забітымі дошкамі вокнамі. Наводдалек відно было і яшчэ некалькі будынкаў. Гэта быў той самы куток, які называўся «хаткі», дзе Рыгор Федаркевіч палажыў усе свае сілы на раскарчоўцы Залеўскаму дзікіх зараснікаў. Хлопец умомант даімчаўся да чырвонаармейцаў. На зямлі быў раскладзен вялікі агонь і навакол яго ляжала шмат чырвонаармейцаў з перавязанымі ранамі. Каля самага-ж агню стаяла старая жанчына і грэла працягненыя рукі.

— Маці!—гукнуў хлопец яшчэ зводдалі.

Жанчына кінулася абнімаць сына і ўсё прыгаварвала:

— Антон, Антоська, а хата наша цэлая засталася. Я цябе адразу і не пазнала, як ты бег. А чаму ты кульгаеш, Антоська?

— Такая нага ў мяне засталася, так яна залячылася (пячаць вялікага гора легла на жанчынін твар). А дзе бацька?

— Бацька ў партызаны пазаўчора пайшоў, мусіць, недзе падаўся з чырвонаармейцамі далей, калі дадому не прышоў.

— Ого, а як дагэтуль вы жылі?

— А ў бацькавага брата прытуліліся, так і перазімавалі. Бацька хварэў узімку. А калі папраўляўся, то два разы прыходзіў сюды глядзець хаты. Выгнаў-жа такі тады з яе Залеўскі нас, а бацька ўкрадкі забіў вокны і дзверы дошкамі, мы ўсё спадзяваліся, ажно-ж і прычакалі... Спачатку ночы прышлі туды, у вёску, большэвікі і дзве чырвонаармейскія фурманкі адразу адтуль сюды паехалі. Яны мяне прывезлі сюды. Прыязджаю—аж тут кладуць агонь, свецяць ліхтарамі і адбіваюць сякерай дошкі ад дзвярэй. Носяць сюды раненых, а там, у хаце, дактары перавязваюць ім раны... А ты як?

—А я ўжо з тыдзень выйшаў з больніцы, але тут быў такі неспакой. Я пабойваўся адразу паказвацца, думаў, счакаю крыху, і не ведаў, дзе вы з бацькам. Я ўжо два дні, як іду з горада следам за чырвонымі. А сёння ўночы быў у Сумлічах.

— Можа, Настачку і Ульяну бачыў?

— Бачыўся з Ульянаю. Большэвікі ўжо, мусіць, далёка ўвайшлі?

— Ад палякаў і следу няма... А Залеўскі, мусіць-жа, уцёк, тут не застаўся?

Яна і сама ведала, што Залеўскі ўцёк, але сказаць гэтую фразу многа для яе значыла.

— Ох, як мне пра яго Ульяна расказвала! Перад выездам ён утрапёны дабег да палавіны Сумліцкай вуліцы і, як атручаны, назад вярнуўся.

Так гэтыя двое людзей, малады хлопец і старая жанчына, гаварылі радасна, з самым наіўным, шчырым, быццам дзіцячым выглядам. Усё стала добра з гэтага дня на свеце і толькі думка аб скалечанай сынавай назе атручвала жанчыне радасць.

— Тут усю ноч вёска гарэла,—гаварыла яна.—Ці палякі падпалілі, ці так ад вайны. Чуеш, дымам цягне з таго боку?

У гэты час доктар у белым халаце і з закасанымі рукавамі выйшаў з хаты.

— Эй, друг,—гукнуў ён Антону.—Чаго так стаіш? Памагай, у мяне людзей няма. Унь у цябе пад нагамі сякера, бяры, адбівай дошкі ад вакон, на двары сонца ўзышло, а я пры ліхтары працую.

Антон хапіў сякеру і падбег да хаты, крыкнуўшы доктару:

— Там жывы польскі афіцэр ляжыць пад хвоямі!..

— Зараз усё абгледзім!—адказаў таксама крыкам доктар... — Эй, братцы, жывей!

Апошняя фраза адносілася да санітараў, якія ў гэты момант неслі трое насілак з раненымі. Доктар пабег у хату, а Антон ужо біў сякерай у канец дошкі, прыбітай да вакна. З якой асалодай ён рабіў гэту работу! Гэта ён даводзіць да парадку сваю хату! Прастадушны і просты чалавек, ён не мог быць без беспераыннай усмешкі на твары. Гэтая ўсмешка то расплывалася па ўсім твары, то сыходзілася толькі ў вочы, а пасля зноў свяціла на твар. Вось ён адбіў дошкі ад першага вакна, пасля ад другога. У некаторых вокнах яшчэ захаваліся шыбы. Антон узлёг грудзьмі на ваконную шуфляду і зазірнуў у сярэдзіну хаты. Калісьці ён пажыў у ёй усяго некалькі дзён. Якая выгада будзе цяпер жыць тут! Прасторная хата на падлозе, з вялікімі вокнамі. Сцены з смольнага моцнага дрэва. Гэта будзе гняздо для жыцця назаўсёды, на ўвесь век, да самай старасці хопіць гэтых сцен—сваіх уласных, здабытых чалавекам у працы, як узнагарода за ўсё мінулае.

Е. РАМАНОВІЧ

НАСТА ВЕРАС

Кіно-п'еса «Наста Верас» прысвечана паказу вызвалення заходне-беларускага народа ад іга польскіх акупантаў.

Аўтар імкнецца ў сваім творы паказаць шлях беларускай жанчыны ад бяспраўнай панскай батрачкі да дэпутата Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Друкуем урывак з 1-й часткі кіно-п'есы.

Вясна 1939 года.

Доўгая дарога, віхляючы вужакаю, успаўзла на высокі ўзгорак і знікла за ім, правалілася. Калі глядзець знізу на ўзгорак, здаецца, што круча за ім такая, што свет там канчаецца. Перад узгоркам лес, поле.

На дарозе разводдзе.

Цягнецца цяжка нагружаны гноем воз, куляецца на калдобінах, западае ў выбоіны. Ад маленькага, сухога коніка хмарай падымаецца пар. Конь напружвае жылы, асцярожна ставіць ногі, стараецца з усіх сіл усцягнуць воз на ўзгорак.

Наста, якая ідзе каля воза, крыкам і пугай і ўласным плячом памагае каню. Доўга яны так змагаюцца з пераваламі, ды раптам нахіліўся воз на бок і споўз з дарогі ў роў, пацягнуўшы за сабой і коніка. Хамут сціснуў бедалазе горла. Вылупіў вочы конь, высунуў язык і залыхнуўся.

Кінулася Наста рассупоньваць хамут, падымае каня: «Устань, ну, устань, міленькі, любенькі. Устань, даражэнькі, падыміся. Но, коська, но! Но, мой добры, харошы, но, каб на цябе агонь. Устань-жа, устань, падла! Устань, каб на цябе каршун!» Пачынае сцёбаць каня пугаю, спачатку паціхеньку, пасля ўсё з большай ярасцю. Стаміўшыся, звалілася на каня і тут толькі ўразумела, што конь не дыша, што ён здох. Наста скамянела на момант, пасля дзікі крык вырваўся з яе грудзей: «А-а-а, і што я цяпер рабіць буду? Прапала-ж я цяпер, прапала».

Наста стала на калені, узняла рукі ўгору: «Божачка літасцівы, ты ўсё бачыш, ты ўсё можаш, дапамажы-ж. Зрабі цуд, ажыві яго, ажыві.

Да Насты падыходзіць Гэлька, вяскова дзяўчына:

— Што з канём, Наста?

Наста. Ляжыць нерухомы.

Гэлька. Чый-жа гэта конь? У цябе свайго няма, здаецца.

Наста. Румзаў конь, пазычыла, гною на поле завезці.

Гэлька. А-ай-ай. Бедная-ж ты, Настачка, што-ж цяпер будзе?

Наста. І сама не ведаю.

Гэлька. З'есць-жа ён цябе, пан Румза, згрызе.

Наста. З'есць.

Гэлька. Ай-ай-ай, бедная-ж ты мая Настачка.

Села каля яе, прытуліла да сябе.

***

Па полю ідзе пан Румза, у руках у яго сажэнны цыркуль. Ён мерае зямлю, за ім следам ідзе малады парабак Ясь.

Пан Румза (мераючы, лічыць уголас). Тысенца седэмсэт пятнасце, тысенца седэмсэт шаснасце, тысенца седэмсэт семнасце...

Стаў, адлыхаўся. Яму горача. Ён кругленькі, тоўсценькі. Скінуўшы кажух, ён кінуў яго на рукі парабку, а сам застаўся ў марынарцы. (Да Яся). — Іле? — Зноў узяўся за цыркуль.

Ясь (усхапіўся ад задумення). Тысяча семсот... (Запнуўся).

— Ну? — крыкнуў пан Румза.

— Тысяча семсот пятнаццаць, — шпарка вымавіў Ясь.

— Тысенца седэмсэт пятнасце, тысенца седэмсэт шаснасце, тысенца седэмсэт семнасце. — Пан Румза зноў стаў. — Фу-у-у... до яснэй холеры ценжко.

Ясь. Зямлі многа ў пана Румзы.

Пан Румза. Многа, многа, не больш, як у людзей.

Скінуў марынарку, плюнуў на рукі, узяўся за цыркуль:

— Іле?

Ясь. Тысяча семсот дваццаць.

Пан Румза. Тысенца седэмсэт двадзесце, тысенце седэмсэт двадзесце едэн, тысенца седэмсэт двадзесце два, тысенца седэмсэт двадзесце тшы...

Ясь. Пане, вы ўжо не сваю зямлю мераеце.

Пан Румза (стаў). Як гэта, не сваю?

Ясь. Ад гэтай тычкі Верасава палоса ідзе.

Пан Румза. О, до яснэй холеры! То-ж вшыстко едно, моя земя, ніякай ружніцы, ешчэ ковалэчэк і было-б тысенца седэмсэт двадзесце пенць. О, Езус Мар'я!

Ясь. Яшчэ-б крышачку і было-б дзве тысенцы.

Пан Румза. Не, там юж земя пана Корбут-Міхальскего. А гэтая палоска якраз-бы до мне і былі-б мы поўнымі суседзьмі. Граф Корбут-Міхальскі і пан Румза. Яснавельможны пан, малады продак старадаўняга польскага роду паноў Корбут-Міхальскіх, і шляхціч пан Юзеф Румза. Га? (Да парабка, які ўглядаецца ў даль). Цо мувіш, Ясь, до яснэй холеры?

Ясь. Нечы воз у роў зваліўся і конь не ўстае.

Пан Румза (углядаецца, гаворыць як-бы сам сабе). Я дзісяй пазычыў каня Насце Верас гной на поле перавезці. Ці не мой гэта конь там?

Ясь. Напэўна, ваш.

Румза. Баба каля возу. Мой конь, няйначай. О, Езус Мар'я! (Кінуў цыркуль, бяжыць). О, раны боске, што-б там магло здарыцца?..

Па дарозе ён скідвае з сябе шарф, які ціcне яму шыю, і кідае на рукі бягучага следам Яся.

Каля воза Наста. Пуста гледзячы ў даль, яна ціха гаворыць Гэльцы:

— От, такое маё жыццё, Гэлечка. Жыву сіратою, адна на ўвесь свет.

Гэлька. Замуж-бы выйшла.

Наста. Замужам-жа я.

Гэлька. Ну, якое-ж гэта замужства, столькі часу няма чалавека.

Наста (ціха). Там-жа ён, на савецкай зямлі.

Гэлька. Скуль ты ведаеш? Можа, і памёр даўно.

Наста. Чуе маё сэрца, што жыве.

Гэлька. Калі і жыве, дык усёроўна, што мёртвы, — граніца.

Падбягае пан Румза: — О, Езус Мар'я, нешчэнсце. Муй конь, далібог, муй конь.

Гэлька. Здох твой конь.

Пан Румза (нахіліўся над канём). Но, коська! Коханэчэк муй, любы, но!.. (Тузае каня).

Ясь. Не ўстане ўжо, канец.

Пан Румза. Ай-ай-ай, такога каня загнаць, што-ж гэта будзе, Наста?

Ясь. Ты што, смяешся з яе? Які-ж гэта конь? Сабака і той дужэйшы.

Пан Румза (злосна да Яся). А ў цябе хто пытаецца? Ты што за абаронца такі?

Ясь. А ты ўжо і рады беднага чалавека пакрыўдзіць.

Пан Румза. Муй конь! Муй. У суд яе, у суд. Я свайго не аддам, яна мне заплоціць. Но, коська, но! (Сцёбае каня пугай).

Па абочыне дарогі ідуць Станіслаў Корбут-Міхальскі і ўпраўляючы яго маёнткам пан Казімір. Яны ў паляўнічых вопратках, за плячыма стрэльбы. За імі следам на дарозе цягнецца лінейка, на ёй у ягдташах здабытак палявання,—нацюрморт са звіслых акрываўленых галоў і лап. Следам за лінейкай егер вядзе зграю паляўнічых сабак.

Пан Казімір (ідучы, гаворыць пану Станіславу). Совецкія эксперыменты над зімаўстойлівымі мнотагадовымі пшанічнапырэйнымі гібрыдамі маюць вялікую цікавасць, пане грабе.

Пан Станіслаў (аглядае палі). Цяпер не час для эксперыментаў, пан Казімір. Трэба сеяць жыта — не сёння, заўтра нам прыдзецца ваяваць. Трэба думаць пра хлеб для арміі.

Пан Казімір. Слухаем, пане грабе.

Пан Станіслаў. Купляйце зямлю і сейце жыта, пане Казімір. Ваеннае міністэрства будзе рабіць запас, цэны на хлеб узрастуць. (Падняў кінуты на зямлю цыркуль, разглядае яго). Хто гэта тут зямлю мерае?

Пан Казімір. Гэта палоска ўдавы Насты Верас.

Пан Станіслаў. Прыкупіце гэтую зямлю.

Пан Казімір. Не прадае.

Пан Станіслаў (здзіўлена). Чаму?

Пан Казімір (разводзіць рукамі). Сама апрацоўвае. Жыве з гэтага, не хоча прадаць.

Пан Станіслаў. Прапануйце ёй службу ў маёнтку і купіце зямлю. Энергічней, энергічней, пане Казімір.

Каля паваленага воза сабраўся народ.

Румза (крычыць на Насту). Ты мне заплоціш за каня.

Наста. Няма чым мне заплаціць. Няма ў мяне грошай зараз, пачакай да ўраджаю.

Румза. Зямлю вазьму.

Наста (рашуча). Зямлі не аддам.

Румза (учапіўшыся ў яе, цягне за руку). У суд ідзем, у суд.

Галасы з натоўпу:

— Куды ты яе цягнеш? Яна-ж бедная ўдава, сірата.

— Але-ж калі пазычыла каня, загнала, трэба і сквітацца, конь-жа ягоны.

— Які-ж гэта конь, здыхляціна нейкая.

— Можа, ён наўмысля ёй яго падсунуў, каб абабраць, зямлю адхапіць?

— А колькі там тае зямлі?

— Э-э, хто не ведае пана Румзу?

Румза цягне за руку Насту: — У суд, у суд ідзем.

Да натоўпу падыходзяць пан Станіслаў і пан Казімір. Натоўп расступаецца перад імі, людзі скінулі шапкі і нізка кланяюцца.

Пан Станіслаў. Цо тут ест?

Пан Румза (кланяецца). Добры дзень, ясны пане. Проша пана грабе—пазычылым кобеце коня, а она яго змардовала і нехцэ плаціць.

Наста (хмура). У мяне грошай няма зараз...

Румза. Зямля ў цябе ёсць, я вазьму зямлю, яшчэ і прыплачу табе.

Наста. Зямлі я не прадам.

Румза. О, чулі вы яе, вар'ятку? Сама апрацаваць не можа і другім прадаць не хоча.

Пан Казімір (ціха пану Станіславу). Гэта тая самая Наста Верас, аб якой я вам казаў.

Пан Станіслаў (да Румзы). А гды ў кобеты сапраўды нема пенёндзэ на тэн час, пане Румза?

Гэлька. О, паночку, іх у яе ніколі няма.

Пан Румза. Ясны пане, цо мне до тэго? Ест пенёндзэ, нема пенёндзэ—муе ест муе.

Пан Станіслаў. А гды она не може тэраз заплаціць, она ест бедна кобета.

Пан Румза. Ясны пане, цо мне до тэго, ці мала ў нас бедных людзі?

Пан Станіслаў. Она ест людына Жэчыпосполітэй Польскей.

Пан Румза. Я, пане грабе, тэж ест людына Жэчыпосполітэй Польскей.

Пан Станіслаў (да пана Казіміра). Проша пана Казіміра заплаціць пану Румзе за ту падлу і даць беднай кабеце коня з лінейкі завезці воз, зараз-жа, прэндко. (Шпарка выйшаў з натоўпу).

Усе стаяць ашаломленыя.

Старая кабета да Насты: — Руку цалуй пану, руку цалуй.

Наста машынальна зрабіла два крокі ўперад, але пан Станіслаў шпарка пайшоў па дарозе.

Галасы ў натоўпе:

— Вось гэта пан, добры пан. Ён сэрца мае. (Да Румзы). Не па-хрысціянску ты, пане Румза.

Румза. Што вы ад мяне хочаце, я бедны шляхціч.

Людзі дапамагаюць кучару выпрагчы каня з лінейкі і ўсцягнуць воз на дарогу.

Пан Казімір да Румзы:—Спадзяюся, мы з панам Румзай палічымся.

Пан Румза. Грошы ест грошы, пане коханы, мне што...

Дужы конь лёгка пацягнуў воз на ўзгорак, за возам бадзёра крочыць Наста.

***

Стары замак паноў Корбут-Міхальскіх. Праз анфілады пакояў ціха ідзе пан Станіслаў.

Раніца. Сонечныя праменні ледзь прабіваюцца праз каляровыя віражы вокнаў замку, дзівосным узорам ляжаць на падлозе, пераліваюцца на велічэзных, пісаных маслам, партрэтах радавітых продкаў.

Пан Станіслаў курыць цыгарку, задумліва ходзіць па пакоях. Часам ён спыняецца каля таго ці іншага партрэта, тады твар якога-небудзь рыцара ці магната мяняецца на твар самага пана Станіслава. Пан Станіслаў марыць.

Ціха расчыняюцца дзверы. Уваходзіць лакей, ён дакладвае:

— Пшэпрашам, пане грабе, пшышла Наста Верас.

Пан Станіслаў уваходзіць у другі пакой. Пры яго з'яўленні Наста Верас нізка кланяецца:

— Дзякую яснаму пану, жыццё вы мне вярнулі, дапамаглі мне, дзякую.

Пан Станіслаў. Нема за цо.

Наста. Прашу міласці ў пана, грошай пану я зараз не змагу вярнуць. Восенню, паночку, як ураджай прадам, ужо тады...

Пан Станіслаў. Ніц, ніц, нацо тобе плаціць, ты адслужыць можаш. Прыходзь у замак працаваць, пакаёўкай ці на кухні.

Наста. Дзякую, паночку. Але баба я дужая, сілы ў мяне яшчэ ёсць. Я на зямлі працаваць люблю, зямлю варочаць, сеяць, жаць.

Пан Станіслаў. Ну, добра, на зямлі будзеш у мяне батрачыць. Мы табе даплоцім і прырэжам тваю палоску да нашай зямлі. Ты-ж яе ўсёроўна апрацаваць добра не зможаш, не ўродзіць нічога на ёй. А мы табе добра заплоцім. Ну, ідзі, ідзі сабе з богам.

Пан Станіслаў выйшаў з пакоя.

Наста спускаецца з лесніцы, за ёй следам ідзе Казімір. Гаворачы, яны выходзяць на двор.

Пан Казімір. Можаш сабе ісці ў суд, калі хочаш. Але-ж грошы, якія пане грабе загадалі заплаціць за каня, ты-ж нам вінна.

— Гады вы, каб на вас немач, ось што я вам скажу, — нервова крыкнула Наста проста ў твар утаропленага пана Казіміра. Закрыўшы хусткаю твар, яна заплакала і кінулася бегчы.

Корбут-Міхальскі, які стаіць на балконе, з усмешкаю глядзіць на пана Казіміра.—Энергічней, пане Казімір, энергічней,—кідае ён зверху ўніз.

— Слухам, слухам пана,—пакланіўся і выйшаў пан Казімір.

ЗАМАЦАВАЦЬ ТВОРЧЫЯ ПОСПЕХІ

1 ліпеня закончыў свае гастролі ў Мінску Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР. Тэатр паказаў сталічнаму гледачу спектаклі: «Сабака на сене» Лопе дэ-Вега, «Небяспечны паварот» Прыстлі.

Гастролі ў Мінску з'явіліся творчай справаздачай калектыва тэатра за мінуўшы пасля яго рэарганізацыі час.

У мінулым штогод па сканчэнні сезона калектыў тэатра распадаўся. Артысты, сабраныя з усіх гарадоў Совецкага Саюза на адзін сезон, адносіліся з вялікім раўнадушшам да далейшага лёсу тэатра. Не было і патрэбнага мастацкага кіраўніцтва.

На падставе ўказанняў ЦК КП(б)Б і СНК БССР, у чэрвені 1939 года было прынята рашэнне: уліць у тэатр групу выпускнікоў адной з лепшых совецкіх тэатральных устаноў — Ленінградскага тэатральнага вучылішча,—людзей адзінай школы, адзінага творчага напрамку, совецкую акторскую моладзь. Разам з гэтай акторскай моладдзю лепшыя работнікі ранейшага калектыва—народны артыст БССР ордэнаносец Д. А. Орлоў, заслужаная артыстка рэспублікі А. В. Обуховіч, заслужаны артыст рэспублікі Н. Е. Аблоў, артыст В. Я. Канаплянскі—узяліся расціць сапраўдны Рускі тэатр БССР.

Прыехаўшая моладзь з першых-жа дзён знайшла агульную прафесіянальную мову, творчы кантакт з групай памянёных вышэй актораў. З першага-ж дня быў створан адзіны творчы ансамбль.

З навучальнай установы моладзь прывезла з сабою два вучнёўскіх спектаклі, якія былі ўключаны ў рэпертуар тэатра: «Таленты і паклоннікі» Астроўскага, «Каварства і любоў» Шылера. За перыяд з 1 кастрычніка 1939 года, калі ўпершыню была ўзнята заслона рэарганізаванага тэатра, і да 1 ліпеня гэтага года выпушчаны спектаклі «Загавор» Вірты, «Сабака на сене» Лопе дэ-Вега, «Небяспечны паварот» Прыстлі, «Казка» Светлова. Напярэдадні выпуску спектакль «Крэмлёўскія куранты» Пагодзіна.

Маладыя акторы атрымліваюць асноўныя ролі і большасць з іх ад спектакля да спектакля, ад ролі да ролі няўхільна творча расце. Акторская моладзь у нашым тэатры мае такія адказныя ролі, як Фердынанд у спектаклі «Каварства і любоў»—артыст Карнаухаў, Негіна ў «Талентах і паклонніках»—артыстка Кавалёва, яна-ж Бецці ў «Небяспечным павароце», Луіза ў спектаклі «Каварства і любоў», Тэадор у «Сабаку на сене»—артыст Фрэйдзін, Трыстан у «Сабаку на сене»—артыст Іваноў, Олуэн у «Небяспечным павароце»—артыстка Чэмберг і г. д.

Побач з агульным творчым ростам тэатра ажывілася палітычнае, грамадскае жыццё ў калектыве.

У гэтым годзе тэатр выпусціць «Крэмлёўскія куранты» Пагодзіна і два складанейшых класічных спектаклі, на якіх маладыя акторы вельмі многаму навучацца,—камедыю Шэкспіра «Многа шуму з нічога» і «Сірано дэ-Бержэрак» Растана.

Недахопам тэатра з'яўляецца тое, што да гэтага часу ў яго рэпертуары не прадстаўлена беларуская драматургія, але не пазней наступнага сезону гэты прабел будзе запоўнен. Тэатр будзе працаваць над творамі беларускіх драматургаў. Асноўнай-жа сваёй мэтай тэатр ставіць паказ працоўным БССР лепшых твораў совецкіх драматургаў, рускіх і заходнееўрапейскіх класікаў. Выходзячы з гэтага прынцыпу, тэатр намячае да пастаноўкі ў бліжэйшы час п'есы Горкага, Астроўскага.

З моманту рэарганізацыі тэатра не мінула яшчэ і года. Але і за гэты час тэатр значна творча вырас. Тэатр, вядома, яшчэ не стаў тым высокамастацкім арганізмам, культурна-палітычным цэнтрам, магутным правадніком вялікай рускай культуры, якім ён павінен быць ва ўмовах БССР. Задачы, якія стаяць перад тэатрам у галіне далейшага палітычнага і творчага росту яго калектыва, авалодання складаным і цікавым рэпертуарам—вялікія.

Увага партыі і ўрада, увага сталічнай грамадскасці, праяўленая да тэатра ў часе яго гастроляй у Мінску, натхняе калектыў тэатра на заваяванне новых творчых поспехаў.

Мы шчаслівы тым, што паказ спектакляў у Мінску быў не вузкай гастроллю, а своеасаблівай справаздачай аб праробленай рабоце перад грамадскасцю сталіцы.

А. А. СЯРГЕЕЎ.

Дырэктар Дзяржаўнага рускага тэатра БССР.

АБ ПАЭТЫЧНЫХ ПЕРАКЛАДАХ І ДОБРАЙ КНІЗЕ

Ацэнка «добрая кніга» у адносінах зборніка вершаў Максіма Багдановіча здасца многім парадаксальнай і дзіўнай. М. Багдановіч даўно прызнан буйнейшым паэтам, вершы яго любяць, чытаюць напамяць; маладыя паэты вучацца ў яго. І хіба кніга выбраных вершаў М. Багдановіча можа быць дрэннай? Так, адкажам мы, перакладная кніга М. Багдановіча магла аказацца дрэннай. Але на нашу вялікую радасць, яна—добрая, вельмі добрая.

За апошнія гады ў рускага чытача моцна вырасла цікавасць да нацыянальнай культуры і, у асаблівасці, да нацыянальнай літаратуры братніх народаў. Шырока адзначаныя ўсёй совецкай грамадскасцю юбілеі Шэўчэнкі, Руставелі, Хетагурава, Цэрэтэлі, праведзеныя ў Маскве дэкады беларускай і азербайджанскай літаратур з'яўляюцца лепшым доказам гэтай цікавасці. У кожным нумары любога цэнтральнага журнала мы абавязкова знойдзем творы нацыянальных пісьменнікаў. Але многа гаварылася, пісалася, ды і гаворыцца на сёнешні дзень аб нядобраякаснасці перакладаў, у прыватнасці паэтычных. Не раз прыходзіцца чуць ад паэтаў, што пераклады іх вершаў не толькі не падабаюцца ім, але што ў гэтых перакладах яны не пазнаюць самых сябе.

Тлумачыцца гэта, па-першае, тым, што многія рускія перакладчыкі не ў дастатковай меры ўсведамляюць адказнасць той справы, за якую яны бяруцца. Для многіх з іх не мае ніякага значэння ні тое, якога паэта перакладаюць, ні творчая самастойнасць паэта, ні нацыянальны каларыт твора, мыслі і пачуцці аўтара. Другая прычына, на нашу думку, заключаецца ў тым, што многія перакладчыкі не ведаюць моў, з якіх яны перакладаюць, і ім прыходзіцца карыстацца падрадкоўямі, а агульнавядома, што нават вельмі добрае падрадкоўе ні ў якай меры не можа замяніць арыгінала. Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што крытыка рэдка займаецца дэтальным параўнаннем перакладаў з арыгіналамі.

З усяго вышэй сказанага, вядома, не трэба рабіць вывад, што ўсе пераклады робяцца дрэнна. Наадварот, дрэнных перакладаў пачынае станавіцца ўсё менш. Выкрышталізоўваецца значная група перакладчыкаў сумленных і любячых сваю справу, таленавітых і прафесіянальных у высокім сэнсе гэтага слова.

Лепшым доказам з'яўляецца рэцэнзіруемая намі кніга выбраных вершаў М. Багдановіча, выдадзеная ў Дзяржлітвыдаце СССР пад рэдакцыяй і з уступным артыкулам Еўгенія Мазалькова, у перакладзе М. Ісакоўскага, Б. Ірыніна і І. П. Семынніна.

Самае добрае ўражанне ствараюць пераклады Ісакоўскага. Ісакоўскі даўно займаецца перакладамі з беларускай мовы. Ён ведае мову і адчувае яе. Асабліва яму ўдаюцца пераклады народных песень і вершаў, апрацоўваемых пад народныя матывы. Добра ведаючы народны рускі стыль, ён знаходзіць у сваім лексіконе словы, аналагічныя і ўпаўне замяняючыя беларускія народныя звароты.

Добрыя пераклады Ірыніна. Ірынін—адзін з культурнейшых нашых перакладчыкаў. Вершы ў яго перакладзе вельмі дакладны. Ён найбольш поўна захоўвае і перадае аўтара. Мова яго перакладаў—добрая руская мова. Для прыкладу можна прывесці санет М. Багдановіча «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі». Вось беларускі тэкст санета:

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ужо колькі тысяч год стаіць магіла:
У гаршчку насення жменю там знайшлі.
Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё-ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйнае скаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.
Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны, нарэшце, дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў, крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

А вось яго рускі тэкст:

Среди песков Египетской земли,
Над водами синеющего Нила,
Уж сколько тысяч лет стоит могила;
Там горсточку семян в горшке нашли.
Хоть зерна высохли, но все же проросли,
Их пламенная жизненная сила
Проснулась вновь, пшеницу всколосила,
И урожай те зерна принесли.
Вот символ твой, отчизна дорогая!
Взметнувшийся от края и до края
Народный дух бесплодно не заснет,
Он к свету ринется, как та криница,
Которая стремится ввысь, вперед,
Чтоб из-под почвы на простор пробиться.

Адно, што выклікае неўразуменне, гэта — чаму з рускага тэкста выпала прысвячэнне і эпіграф?

Вялікая частка вершаў перакладзена Семынінным. У асноўным, яго пераклады добраякасныя, але яны зроблены вельмі няроўна. А некалькі рэчаў перакладзены ім наогул дрэнна. Як прыклад, можна прывесці цудоўную казку М. Багдановіча «Мушка-зелянушка», напісаную, як і пушкінскія казкі, свабодным памерам народных песень. Сам М. Багдановіч у падзагалоўку падкрэслівае: «Выкладзеная згодна праўды беларускім вершам». Семынін у большасці не мог перадаць тонкага гукавага ўзору казкі. Акрамя таго, самае абыходжанне яго з тэкстам вельмі неахайнае і вольнае. Напрыклад, у М. Багдановіча:

Як пачуў тыя жаласні камарык —
Паскрабаў і пачухаў ён і тварык:
«А чаму-б мне з ёй не ажаніцца?
Пэўна, пойдзе, каб болей не журыцца.
Хоць насаценькі я, шэры, хударлявы,
Дык у скоках затое-жа рухавы...
І схапіўся камарочак прыбірацца,
Каб да мушкі-пяюшкі ўвіхацца.

У рускім перакладзе:

Как услышал эти жалобы комарик,
Сильно призадумался сударик:
«А почто бы мне на ней и не жениться?
Знать, пойдет, уж коли так она томится.
Хоть носатый я, и тощий, и нескладный,
Так зато сказать умею ладно».
И ударился комарик, как из пушки (?!),
Кликать сватов к мушке-зеленушке.

Не гледзячы на гэтыя пагрэшнасці, проста і выдатна выдадзеная кніга робіць добрае ўражанне. Вельмі ўдалы падбор вершаў. Лішняга нічога няма, хутчэй тады можна было-б што-небудзь дадаць. Напрыклад, незразумела, чаму ў кнігу не ўвайшлі такія выдатныя чатыры радкі М. Багдановіча, як:

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага яснага дня!
Паглядзі, як усход разгараецца,
Колькі ў хмарах залётных агня!—

у той час, як іх можна было паставіць эпіграфам да ўсёй творчасці паэта.

Уступны артыкул дае ацэнку творчасці паэта. Рускаму чытачу, які амаль упершыню сустракаецца з творчасцю М. Багдановіча, будзе цікава і карысна прачытаць яго.

Мы ўпэўнены, што кніга выбраных вершаў М. Багдановіча стане любімай кнігай усіх, хто любіць паэзію.

А. КУПЕРШТОК.

КУРСЫ МАЛАДЫХ АЎТАРАЎ

Пры праўленні Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР з 8 ліпеня пачалі сваю работу курсы пачынаючых паэтаў і пісьменнікаў. На курсы прыехалі маладыя аўтары з Беластока, Віцебска, Гомеля, Чэрыкава, Рагачова, Слоніма, Пружан. Сярод курсантаў — Селіверстаў С. Л. — аўтар паэмы на рускай мове «Сваякі», рускія маладыя паэты — Дзенісенка І. Ф., Шыпнеўская В. А., беларускія маладыя паэты і пісьменнікі — Засім М., Іверс А., Рунец П., Дудо П., польскі пісьменнік Равіч Ю. М. — аўтар трох кніг, яўрэйскія маладыя паэты і пісьменнікі — Бінецкі П. М., Гурштэйн Ш. М., Баруховіч І. Б. і інш.

За месяц работы для курсантаў будуць прачытаны лекцыі на тэмы: класікі марксізма-ленінізма аб літаратуры, старажытная беларуская літаратура, беларуская літаратура XIX стагоддзя, класікі рускай літаратуры, сучасная руская літаратура, класікі заходне-еўрапейскай літаратуры, творчасць беларускіх совецкіх пісьменнікаў, вобраз народнага героя ў совецкай літаратуры, выкарыстанне народнай творчасці ў літаратуры, абаронная тэма ў беларускай літаратуры, пісьменнікі на фронце і інш.

Беларускія совецкія пісьменнікі Я. Колас, З. Бядуля, М. Лынькоў, К. Чорны, П. Глебка, М. Клімковіч і інш. раскажуць курсантам, як яны працавалі і працуюць над сваімі творамі.

У рабоце курсаў прымуць удзел лепшыя кваліфіцыраваныя навуковыя сілы: праф. М. К. Дабрынін, Ю. Дворкіна, Я. Шараховскі, М. Ларчанка, Р. Скаліна, крытыкі М. Клімковіч, А. Кучар і інш.

На курсах будзе наладжана абмеркаванне творчасці пачынаючых паэтаў і пісьменнікаў. За час навучання на курсах маладыя аўтары пабываюць на спектаклях Ленінградскага драматычнага тэатра імя Горкага і Віцебскага беларускага драматычнага тэатра, якія гастраліруюць у Мінску, прагледзяць лепшыя кінофільмы, наведаюць музеі.

А. П.







19 год стагнала Заходняя Беларусь пад пятой польскіх акупантаў. 17 верасня 1939 года слаўная Чырвоная Армія перайшла дзяржаўную граніцу і палажыла канец здзекам і гвалту паноў і капіталістаў у Заходняй Беларусі. Сёння працоўныя заходніх абласцей БССР пры дапамозе братніх народаў вялікага Совецкага Саюза радасна і шчасліва будуюць бяскласавае соцыялістычнае грамадства. Права на працу, на асвету, на адпачынак, на забеспячэнне ў старасці дала ім Сталінская Канстытуцыя. **На здымках** (злева направа): 1) Заняткі мастакоў-самавучак у ізостудыі брэсцкага Дома мастака; на пярэднім плане—селянін в. Баравічы Камянецкага раёна К. Г. Шахалевіч. 2) Працоўныя гор. Брэста ў выхадны дзень на рацэ Мухавец. 3) Выхаванцы брэсцкага дома груднога дзіцяці за снеданнем. 4) Выхаванцы дзіцячага саду пры Нёманскім шклозаводзе (Баранавіцкая вобласць) на прагулцы ў садзе былога ўласніка завода. 5) Вучні 1-й сярэдняй школы гор. Пінска на прагулцы па рацэ на параходзе.

Фота В. Лупейка і Е. Халдзея, (БЕЛТА).

Усебеларуская алімпіяда дзіцячай творчасці



Усебеларуская алімпіяда дзіцячай творчасці. Удзельнікі танцавальнага гуртка Бабруйскага дома піянераў В. Александроўская, І. Жук, Н. Барадзінская, Б. Кобрынская выконваюць цыганскі танец.

Фота І. Каплінскага.

Дзеці авалодваюць класікай

У арганізацыі дзіцячай творчасці палацы піянераў іграюць асабліва вялікую ролю.

У падрыхтоўцы да Ўсебеларускай алімпіяды дзіцячай творчасці магілеўскі Дом піянераў з'яўляўся цэнтрам кіраўніцтва і дапамогі дзіцячай самадзейнасці. У Доме піянераў была арганізавана кансультацыя па ўсіх відах дзіцячай творчасці. Кіраўнікі ансамбля пляскі — тав. Палуянаў, тэатральнага сектара — тав. Валенцінаў, ансамбля песні і аркестра народных інструментаў — тав. Дзедзіола наведвалі гурткі мастацкай самадзейнасці ў школах, дапамагалі школьнікам рыхтавацца да алімпіяды.

Дом піянераў сістэматычна праводзіў агляды розных відаў творчасці, на якія запрашаліся спецыялісты. Дом піянераў стаў цэнтрам мастацкага выхавання дзяцей.

Рознымі гурткамі Дом піянераў ахоплівае 1.900 дзяцей і налічвае 49 розных гурткоў.

Пад кіраўніцтвам Дома піянераў дзеці падрыхтавалі сур'ёзны па свайму палітычнаму зместу, музыкальна-харавому, балетнаму і тэатральнаму афармленню твор — літаратурна-музыкальны мантаж «Беларусь савецкая-ордэнаносная», прысвечаны XX-годдзю вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Акрамя гэтага мантажа, на абласной алімпіядзе ў выкананні балетнага гуртка была выканана 2-я сцэна з балета «Лебядзінае возера», «Трапак», арабскі і кітайскі танцы з балета «Шчаўкунчык» Чайкоўскага. Тэатральны гурток паставіў п'есу ў вершах «Канькі» Міхалкова.

На Ўсебеларускай алімпіядзе магілеўскі Дом піянераў выступіў з аркестрам народных інструментаў, секстэтам домр і танцавальным калектывам, якія паказалі высокае майстэрства выканання. Аркестр народных інструментаў існуе тры гады. Удзельнічае ў ім 50 чалавек. Рэпертуар аркестра вельмі разнастайны, у ім ёсць складаныя музыкальныя творы Чайкоўскага, Бізэ, Гуно, Леанкавалла і інш.

Ансамбль дзіцячай пляскі пад кіраўніцтвам Палуянава ахоплівае 150 чалавек. У сваім рэпертуары, акрамя народных танцаў, ён мае класічныя сцэны з балетаў «Лебядзінае возера», «Канёк-гарбунок» і асобныя нумары Грыга, Рубінштэйна, Рахманінава і Чайкоўскага.

На Ўсебеларускай алімпіядзе былі паказаны арабскі і кітайскі танцы з балета «Шчаўкунчык» Чайкоўскага і беларускі народны танец «Мікіта».

Ансамбль песні пад кіраўніцтвам Дзедзіола ахоплівае 125 чалавек, у яго рэпертуары шмат музыкальных твораў класікаў, як «Хор дзяўчат» з оперы «Еўгеній Онегін» Чайкоўскага і інш. Выдатную вучобу ў школе дзеці спалучаюць з паспяховай работай у гуртках.

Добрую работу прарабіла дзіцячая ізастудыя, якая ахоплівае 120 чалавек. Экспанаты, напісаныя маслам, акварэллю, алоўкам, адабраны на рэспубліканскую выстаўку.

Ф. КУХАРАЎ.

Дырэктар магілеўскага Дома піянераў.

ШКОЛЬНЫ ХОР

Хор 12-й рускай школы гор. Баранавічы зусім яшчэ малады. Ён арганізаваўся ў лютым гэтага года.

Да прыходу Чырвонай Арміі урокі спеваў у школе былі самымі нелюбімымі урокамі. І не таму, што дзеці не любілі спяваць ці што сярод іх не было здольных і таленавітых дзяцей. Не, яны вельмі любілі песні і сярод іх было шмат музыкальна адароных вучняў. Уся справа заключалася ў рэпертуары, у чужых і нелюбімых дзецьмі песнях.

Зараз наш хор налічвае 75 дзяцей, 49 з якіх прыязджалі на Першую Ўсебеларускую алімпіяду дзіцячай самадзейнасці.

Дзеці з энтузіязмам развучваюць савецкія песні. На абласной алімпіядзе хор заняў першае месца і быў вызначан для ўдзелу ў рэспубліканскай алімпіядзе. Гэта была шчаслівая мінута ў жыцці дзяцей. Началася незабыўная паласа падрыхтоўкі да рэспубліканскай алімпіяды. З вялікім уздымам, з энтузіязмам прыняліся дзеці за работу. Дзеці не адчувалі стомы.

На рэспубліканскай алімпіядзе хор з вялікім пачуццём адказнасці выканаў песні: Александрава «Гімн партыі бальшавікоў», Дзяржынскага «Ад края і да края».

І на гэты раз наш хор атрымаў добрую ацэнку. Песняй аб любімай радзіме, песняй, сагрэтай любоўю гарачых дзіцячых сэрцаў, завяршыла першы шчаслівы савецкі навучальны год дзетвара заходніх абласцей Беларусі.

Ф. ЛОНДАН.

Кіраўнік хора 12-й рускай школы гор. Баранавічы.

М. КЛІМКОВІЧ

КАЦЯРЫНА

Урывак з лібрэта.

Чарговай пастаноўкай Вялікага ордэна Леніна тэатра оперы і балета БССР будзе пастаноўка оперы Н. Н. Шчэглова (па лібрэта М. Клімковіча) «Кацярына». Ніжэй мы друкуем канец I акта лібрэта.

Вясковая моладзь у свята гуляе на беразе ракі Бярозы. Жартаўлівыя песні хлопцаў і дзяўчат гучаць у паветры. На чале хлапцоў Рыгор, на чале дзяўчат Кацярына, якія толькі-што паведамілі хлопцам і дзяўчатам пра тое, што яны сасватаны. Бесклапотную весялосць спыняе шум у вёсцы. Гэта польскія гайдукі, пад началам пана Дулі, сілком зганяюць сялян за вёску і цягнуць рэчы. З натоўпу чуваць прычыты:

Што гэта? Што гэта? Госпадзі божа,
Гвалт нечуваны зграі варожай,
Дзе гэта праўда, дзе гэта совесць!
Што вам патрэбна?

Дуля. Сам князь вам повесць.
Ідзьце, холеры, ідзьце, лайдакі, (штурхае Ксаверыя). Ідзь, пес ты стары!

Алесь. Сам ты — сабака!

Рыгор. За што ты здзекуешся над старым?

Дуля. О, цо то ест? Ты мне пагавары,
Пазнаеш пана Дулю, хаме!

Рыгор. Мы па дзве дулі маем самі,
А ўсё-ж яны—не права, не падстава
Глуміць народ налева і направа.

Кацярына (стараецца адвесці Рыгора. У гэты час уваходзіць князь Капуста, пан Заенчкоўскі, суддзя Бобаецкі і ксёндз).

Капуста (хітравата). Ну, добры вечар, добрыя суседзі!
Я па-суседску к вам, жыццё ваша агледзець —
Ці многа сала ў кублах пахавана,
Ці многа мёду ў кадках назбірана,
Ці многа шкур баброў у вас прыдбана,
Ці будзе чым спаткаць суседа-пана,
Гаспадара і князя з ласкі каралеўскай...

Ксаверый (падносячы падаркі князю: кадушку з мёдам, ручнікі, хлеб-соль, кучу звярыных шкурак).
Ласкавы князь, вяльможны ваявода,
Прымі дары ад простага народа.
Прабач па беднасці. Хоць вольнымі завемся,
Ды дзе-ж прыдбаць багацця ў вечным лесе?
Падаткі ў скарб праз сілу нашу плацім,
Забыліся, калі была закраса ў хаце.

Князь. Забыліся, лянівыя цяцеры?
Дык я напомню вам!
Суддзя, чытай паперу.

Суддзя: «Мы, Сігізмунд II Аўгуст, божай міласцю кароль польскі, вялікі князь літоўскі, князь зямлі жмудскай, зямель рускіх, чыні́м гэтым ведама ўсім, каго гэта належыць. Аддалі мы ў пажыццёвае дзяржанне замак наш на рацэ Бярозе ў воласці Барысаўскай, зямлі рускай, князю Івану, сыну Іванаву, Капусце і цесцю яго пану Юзефу, сыну Станіслававу, Заенчкоўскаму за дваццаць тысяч коп грошай літоўскіх вялікіх. Далучаем да замка вёску Падбярэззе, якая невядома з якіх прычын лічылася вольнай, і вёску Стаўцы збегшага да ворага нашага—маскоўскага цара — князя Глінскага. Даручаем суддзю нашаму каралеўскаму, шляхцічу пану Бобаецкаму, увесці князя пана Івана Капусту ва ўладанне вышэйпісанымі маёнткамі нашымі, апісаць маёнткі пісцы каралеўскімі, правесці памер дзяржаўны і — спагнаўшы падаткі і пошліны за дзесяць год — давесці да нашага ведама аб выкананні.

Рэкс Палоніі—**Сігізмунд Аўгуст.** Лета ад нараджэння божага 1550. Места Кракаў».

Князь. Што скажаце цяпер?

Заенчкоўскі. Пастаньце на калені
Вітаць паноў сваіх.

Ксёндз. Праз многа пакаленняў
Сам госпад бог прадбачыў славу іх
І запісаў ў сіноды боскіх кніг
Супольнае жыццё і вас і князя Яна...
З пакораю прымайце гнеў і міласць пана,
І ўзнагародзіць бог прыбыткамі трайнымі
І статак ваш, і поле, і самых.
Хай будзе хвалена его святое імя.

Заенчкоўскі і Дуля. Амэн.

Сяляне. Што гэта, што гэта дзеецца ў свеце?
О ліхалецце, о ліхалецце!
Скардзіцца трэба, праўды дабіцца,
Або давіцца, або тапіцца.
(З натоўпу выступае абураная Кацярына).

Кацярына. Пабойся, князь, хоць бога,
Калі стыда няма.
Над вёскаю убогай
І так няшчасцяў цьма.
І голад, і галеча,
І рукі ў мазалях.

Хор сялян паўтарае:
Ды волі чалавечай
Ніхто нас не збаўляў.
Хай продкі нахадзіліся,
Як вол той, пад ярмом,—
Мы вольнымі радзіліся
І вольнымі памром.

Кацярына. На небе хмар высока
Імчыцца вольны рой.
Між імі горды сокал
Зрабі ты іх слугой.
Плывуць у лузе рэкі,
Спыні іх хоць на міг.

Хор сялян паўтарае:
Няўжо мы, чалавекі,
Слабей і горш за іх?
Ты хочаш, каб згадзіліся
Ісці мы пад ярмом?
Мы вольнымі радзіліся
І вольнымі памром.

Князь. Іш, шчочкі як—расчырваненліся.
Іш, вочкі як—паразгараліся.
Люблю такіх — прыгожанькіх,
Узяць яе!

Народ. О, божанька!

Князь. Ганіце іх з вачэй маіх!

Заенчкоўскі. Што ёсць у іх — забраць у іх!

Ксёндз. Каб гвалт заціх—лупіце іх.

Рыгор. Чакайце, панскія сабакі,
На дзевак ды на баб—вы храбрыя ваякі.
Спрабуйце лепш са мной.
Падходзь, каму жыцця не шкода.
(З нажом стаў у абарону Кацярыны).

Князь. Ого, які ты, голуб мой,
Такіх з карэннем вырвем мы з народа.
Узяць яго... Яе за мной!

Марына. Ізноў крыві ты прагнеш, князь Іван?
Няўжо не сыт яшчэ крывёю ран
І смерцю сына ты майго?

Князь Капуста. З дарогі прэч!
Не то—абража войстры меч
І галаву тваю і мой аброк,
Што маці́ры даваў
Да смерці даглядаць цябе, Марына.

Марына. Як даглядзеў Марынінага сына?

Князь Капуста. А сын твой вінен сам,
Што супроць князя стаў,
Як гэты вось халоп.
Вядзіце іх. Адам, вазьмі дзяўчыну!
(Гайдукі вядуць звязаных Рыгора і Кацярыну. Алесь — малы хлопчык — пачынае на дудцы наігрываць тэму: «Выйдзем мы, доля, у чыстае поле»).

Марына (на фоне песні).
Не дарам бог пракляў
Бясплоддзем род твой, кат.
Ды пачакай, прыпомніш ты Марыну...

Песню пачіху падхапліваюць сяляне і яна ідзе з глыбінь народа — як скарга, як далёкі гром:
Выйдзем мы, доля, ў чыстае поле,
Цяжкая доля мая.
Ці не спаткаем мужыцкую долю,
Цяжкая доля мая.
Дзе ты, мужыцкая доля, стаілася?
Цяжкая доля мая.
Ці у вірах у мутных утапілася,
Цяжкая доля мая.
Ці у мурах у халодных закутая,
Цяжкая доля мая.
Разам з народам воля пакутуе,
Цяжкая доля мая.

Песня набывае сілу. Яна гнеўна расце. Нерухома стаіць Марына.



«Цар Патап» А. Капкова ў пастаноўцы Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра імя М. Горкага. У ролі Патапа Урлова (справа) засл. артыст РСФСР ордэнаносец В. П. Паліцэймака, у ролі Паўла — артыст-ордэнаносец Г. І. Самойлаў.

Фота І. Каплінскага.

„ЦАР ПАТАП“

Ленінградскі Дзяржаўны Вялікі драматычны тэатр імя М. Горкага.

П'еса маладога драматурга А. Капкова «Цар Патап» расказвае пра цяжкі час у гісторыі рускага народа—«пра сталыпінскую рэформу». Гэты рэакцыйны перыяд развіцця сельскай гаспадаркі Расіі характэрны разарэннем бяднейшых сялян і накапленнем багаццяў міраедам-кулаком, кулаком - хутаранінам. Хутарызацыя раз'ядноўвала сялян, накіроўвала жыццёвыя інтарэсы багацеяў да нажывы, да эксплаатацыі, да накаплення грошай. Усё гэта ўдалося паказаць аўтару на прыкладзе адной сям'і.

...Дабротная руская хата. Лесніца на другі паверх. На першым плане драўляныя спрашыдлы — грузны стол і масіўныя лавы. Кіот з іконамі свяціцеляў. Цяжка пералічыць усю масу прадметаў, якімі загрувашчан пакой. Сярод усяго гэтага хатняга скарбу людзі здаюцца маленькімі, нікчэмнымі істотамі. Яны як-бы рабы гэтага дома. Кожны займаецца сваёй справай, абыдзённай, але патрэбнай для гаспадаркі.

Такое першае ўражанне, як толькі падымаецца заслона.

Гаспадара дома глядач хутка пазнае. Жорсткі ўладарнік Патап Урлоў адразу-ж праяўляе свае якасці злога наглядчыка, дэспатычнага бацькі і прагнага ўласніка. Ён не церпіць ніякага парушэння існуючых законаў тутэйшага хутарскага жыцця. Нават гарэзлівасць сына яго злуе. Патапу здаецца, што ён «пуп зямлі». Не будзь яго, дык усе семнаццаць душ сям'і Урловых загінулі-б. Ён усіх папракае тым, што яны лодырнічаюць, і прымушае працаваць, каб не праядаць дарэмна заробатанага ўлетку. Ён думае пабудаваць фабрыку, жадаючы прымусіць працаваць хатніх «дармаедаў» на сябе і ўзімку. Вартасці чалавека ён вымярае грашыма. Грошы — аснова яго жыцця. Усе гэтыя мярзотныя якасці Патапа Урлова добра ўскрыў і паказаў заслужаны артыст РСФСР ордэнаносец В. П. Паліцэймака.

Мастацкія дэталі, знойдзеныя артыстам, паглыбляюць вобраз, дапаўняюць і пашыраюць тое, што аўтар намеціў пункцірам. Невыпадкова Патап угаварвае бедняка Гаўрылу падпаліць свой дом. Ён як-бы жадае яму дабра, бо за згарэўшы дом Гаўрыла зможа атрымаць страхоўку. Мэта-ж у яго не гэта, а іншая — танна купіць у Гаўрылы зямлю. Але як недаверліва дае Патап Гаўрылу першы задатак! — шкадуючы, з вялікай неахвотай, хаця для такога багача дваццаць рублёў нічога не значаць. Калі Патап выдзеліў Сцёпку і Паўла, ён болей рубля ім не даў на наваселле. І калі яны з неахвотай бралі, дык ён прыстрашыў, што і гэтага не дасць.

Вельмі павучальны яго адносіны да дзяцей. Аплявуха была ўлюбёным метадам выхавання і распешчанага хлопчыка Сашкі, і п'яніцы Мішкі, і працавітага Сцёпкі. Пабоямі ён вучыў іх разумець, што кожны член яго сям'і павінен зарабляць сабе на жыццё, не разлічваць на кішэню бацькі. Рэзультаты гэтых зверскіх адносін да дзяцей былі вельмі плачэўнымі для Урлова.

Нават такі старанны сын, як Сцёпка (арт. А. П. Масквін), не мог перанесці, каб не заявіць аб выдзяленні яго з бацькоўскай сям'і. Артыст усвядоміў супярэчлівасць гэтага вобраза. З аднаго боку, Сцёпка сумленна працуе на бацьку, з другога—сваёй жыццёвай задачай ставіць: абзавесціся ўласнай гаспадаркай і быць незалежным. Сцёпка імкнецца нават быць падобным да бацькі—б'е жонку, кідаецца з кулакамі на брата Паўла, але не ў гэтым мэта яго жыцця. Усё-ж свой уход з дома бацькі ён сустракае радасна. Хаця і тут, у фінальнай сцэне, адчуваецца адданасць бацьку, але з'явіўшаеся новае радаснае пачуццё, што ён робіцца самастойным гаспадаром, бярэ перавагу і становіцца асноўнай тэмай ролі Сцёпкі.

Сына Паўла ўся сям'я сустрэла з вялікай радасцю. Але паяўленне яго абвастрыла ўзаемаадносіны жыхароў дома. Выконваючы ролю Паўла, ордэнаносец Г. І. Самойлаў праз вонкавыя асаблівасці гэтага персанажа, смешную хаду і камічныя жэсты, праз паддакванне бацьку і падпарадкаванасць яму, праз выхваленне—вельмі добра паказаў адмоўнае нутро прамаўляючага падрадчыка, скнарніка, які імкнецца на сродкі бацькі пабудаваць асабістую кар'еру. Але бацька аказаўся разумнейшым за сына, ён выкрыў яго і выгнаў з дома.

Скончыў сваё жыццё Патап Урлоў дэнна, недарэчна, але лагічна правільна. У кожнага чалавека ён выклікаў азлабленне супроць сябе. І за тое, што сыну свайму Канстанціну выбіў некалькі зубоў, прымяняючы свае дзікія метады «выхавання», а потым гвалтоўна хацеў ажаніць яго, ён атрымаў ад сына «пачастунак» — кулю. Хаця роля Канстанціна (арт. А. Ф. Чапурноў) і няярка акрэслена ў спектаклі, Канстанцін пакідае ў глядача вельмі цяжкое і непрыемнае ўражанне. Яго пратэст гіне як-бы бясследна. Калі-б не забойства бацькі, дык ён і не застаўся-б, можа, у памяці. А гэта-ж моцны чалавек, які адважыўся тры гады не гаварыць з бацькам, адкрыта заявіў аб сваёй нянавісці да ўсёй сям'і. Усё гэта патрабавала ад артыста больш пераканальнага паказу характару Канстанціна. Пастаноўшчык выпукліў гэты персанаж у канцы спектакля і прымусіў Канстанціна ратаваць ад пажару маці, якая прасіла яго забраць грошы бацькі, але ён благародна вынёс яе з хаты і нават не звярнуў увагі на рассыпаныя грошы.

Канстанцін быў чалавекам недалёкім. Ён не заўважыў, што яго маці таксама імкнулася да нажывы. Яна паздарма настаўляла дзяцей супроць бацькі, ёсць, відавочна, доля яе ўдзелу ў таямнічым знікненні завяшчання на спадчыну. У асаблівасці заключная сцэна, калі ў часе пажару маці хацела ўкрасці грошы мужа, паказала, што яе заветнай марай было авалоданне грашыма. Але гэта мара была замаскіравана падпарадкаванасцю і запалоханасцю перад Урловым. Гэтыя якасці вобраза Кацярыны ня́ярка паказаны арт. Е. К. Пушілавай.

Адзначаныя факты пераконваюць глядача ў тым, што хаця і багацеў кулак Урлоў, сям'я яго, у сілу эканамічных і палітычных супярэчнасцей, распадалася. Мала мець грошы і зямлю, неабходна яшчэ карыстацца падтрыманнем акружаючых. А Урлоў, наадварот, выклікаў ва ўсіх агіду і нянавісць.

Нават Гаўрыла і той адхінуўся ад яго. Гаўрылу ў п'есе адведзена невялікае месца, але арт. Б. А. Ігнацьеў стварыў выразную ролю. Гэты бядняк сабе на розуме. Ён, як і іншыя беднякі, з'яўляецца той пратэстуючай сілай супроць хутаран, якой баіцца Патап.

Некалькі асобнае месца ў спектаклі займае Лена (арт. В. П. Раманава). Праз яе паказана цяжкая атмасфера урлоўскага дома, якая прымушае яе і Паўла пакінуць бацькоўскі дом.

Цікава выкананы ролі хлопчыкаў Сашкі (арт. М. А. Прызван-Сакалова) і Грышкі (арт. В. А. Осокіна) і дачкі Патапа Любкі (арт. Ю. О. Блюменфельдт).

Афармленне спектакля, зробленае мастаком А. Ф. Басуладзе, адпавядае характару спектакля.

Калі глядзіш спектакль, здзіўляешся празмернаму захапленню бытавымі дэталямі. Нават здаецца, ці не натуралістычна гэта? Але калі пачынаеш уваходзіць у гэтыя «дробязі», пераконваешся, што праз іх пастаноўшчык—народны артыст РСФСР ордэнаносец Б. А. Бабочкін і рэжысёр Г. І. Самойлаў ускрываюць усю нікчэмнасць, нуду і непрыглядную цемраць хутарскага жыцця. У спектаклі часам адчуваецца іронія, асабліва дзеці і моладзь удала высмейваюць парадкі свайго дома.

Зладжанасць ансамбля таксама з'яўляецца заслугай рэжысуры.

Сутнасць «царка» хутарскага жыцця Патапа Урлова добра раскрыў тэатр. Ён дадаў і пашырыў багаты літаратурны матэрыял драматурга А. Капкова і стварыў змястоўны спектакль.

А. ЕСАКОЎ.


Н. ШЧЭГЛОЎ

ОПЕРА „КАЦЯРЫНА“

У 1938 годзе ў газеце «Літаратура і Мастацтва» быў змешчан урывак з новай п'есы М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек». Я прачытаў урывак і ён зарадзіў ва мне імкненне напісаць гісторыка-бытавую народную музыкальную драму. Гэты дзень я лічу пачаткам вялікай і сур'ёзнай работы над операй. Я стаў бліжэй знаёміцца з матэрыялам і з аўтарам п'есы М. Клімковічам. Гэта знаёмства аказалася для мяне надзвычай каштоўным.

Я не менш аўтара тэкста палюбіў «Кацярыну» і магу шчыра сказаць, што пісаў ад сэрца, сканцэнтраваўшы на гэтай рабоце ўсе свае мыслі і пачуцці. Ды і цяжка было не зацікавіцца такой хвалюючай эпапеяй, якой з'яўляецца «Кацярына». Гераічная барацьба трох братніх народаў: беларускага, украінскага і рускага супроць спрадвечнага ворага—панскай Польшчы, вобразы смелых, адважных прадстаўнікоў беларускага народа—Кацярыны, Рыгора і Марыны, іх вялікае, шырокае пачуццё любві да радзімы, да свабоды, шчасця, іх асабісты лёс, характары акружаючых іх людзей, — усё гэта не магло не захапіць мяне, як кампазітара.

Асноўнай дзеючай асобай у оперы з'яўляецца народ і яго выдатныя прадстаўнікі. Адсюль натуральна і тое, што першымі маімі крокамі да напісання музыкі з'явілася паглыбленая работа над беларускім песенна-танцавальным фальклорам. Я ўважліва вывучаў яго характэрныя рысы і ў мелодыях, і ў рытміцы, і ў сугучнасцях. Мне не хацелася выкарыстоўваць народную творчасць у оперы ў парадку голых цытат. Некранутай я пакінуў толькі адну выдатную жніўную песню «Бадай пану», з якой асобныя матывы ўнёс у далейшае развіццё оперы. Я імкнуўся творча перапрацаваць народныя напевы, зрабіць новае і сваё, абапіраючыся на каларыт і характар беларускай песеннасці. Так стварыўся, напрыклад, асноўны вядучы матыў, які праходзіць праз усю оперу, якім яна пачынаецца і канчаецца,—песня «Выйдзем мы, доля, ў чыстае поле»:



У корані яго ляжыць напеўка беларускай народнай песні «Ой шуміць, гудзіць ды дубравушка». Падобным чынам пабудаваны ўсе вялікія хоры ў оперы: і іграваая карагодная сцэна лагнікі дзяўчат і хлопцаў у 1-м акце, і вясельная песня дзяўчат у IV-м акце, і хор сялян у III-м акце, і інш., а таксама і танцы. Прыйшлося папрацаваць і над украінскім фальклорам, паколькі украінскі народ значна прадстаўлен у лібрэта спектакля. У каларыце украінскай песеннасці зроблены вобразы атамана, дзеда Ахрэма і казакаў.

Музыкальны бок оперы пабудован мною на прынцыпе лейтматыўнасці, г. зн. абрысоўкі амаль кожнай дзеючай асобы пэўнай для яго музыкальнай характарыстыкай. Вядучых дзеючых асоб, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі і выхадцамі з народа, я і ў музыкальнай абрысоўцы звязваў з народам. Так, лейтматыў Рыгора выцякае з песні «Выйдзем мы, доля», лейтматыў Марыны—з песні сялян у III-м акце. Для персанажаў сатырычнага плана я карыстаўся каларытам п'янай мазуркі (прапіўшыйся шляхціч пан Дуля), ці гнусавым воклічам каталіцкага богаслужэння (ксёндз Атоній), зрабіўшы з іх музыкальныя характарыстыкі гэтых дзеючых асоб.

Вялікае захапленне работай тлумачылася яшчэ і тым, што лібрэта оперы дае прастор для прымянення самых разнастайных настрояў, пачуццяў. Светлая, задушэўная лірычнасць любві Кацярыны і Рыгора (дуэт у 1-м акце), іх валявыя, насычаныя пачуцці іры сутыкненні з ворагамі (арыя Кацярыны ў І-м акце, сцэна Кацярыны і князя ў ІІ-м акце), драматызм і глыбокая нянавісць пакутуючай Марыны (арыі ў ІІ-м акце), якія прыводзяць яе да гнеўнага выкрыцця і помсты князю (сцэны IV-га акта), сатырычныя фігуры пана Дулі, ксяндза, прыжывалкі Сцефаніі, нарэшце, выражэнне пакут, абурэння, сіл і волі народа—ствараюць вялікі дыяпазон прымянення творчых імкненняў музыканта.

Я імкнуўся правесці ў оперы і разнастайнасць оперных форм, ішоў ад простай песенькі да разгорнутай арыі, увёў многа ансамбляў—дуэты, трыо, квартэт, квінтэт. Маім імкненнем было таксама захаваць музыкальную лінію кожнага вобраза, каб ён заставаўся верным свайму характару.

Прада мною заўсёды стаяў глядач і слухач. Я не гнаўся таму за хітраваннямі, за выдумкамі, за арыгінальнічаннем. Пісаў так, каб гэта было зразумела, проста, натуральна і даходчыва. У той-жа час я і не думаў быць прымітыўным, я не баяўся вайстрыні, а баяўся трафарэту. Больш за ўсё мне страшнавата было эклектычнасці. Падпасці пад розныя ўплывы вельмі небяспечна, вось чаму я асабліва доўга працаваў, да стварэння самой музыкальнай тканіны оперы, над вывучэннем характэрных пабудоў беларускіх напеваў, іх ладавых зваротаў, канцовак, знаходзіў цікавыя і своеасаблівыя фарбы гучанняў, па вопыту ведаючы, што гэта правільны, хаця і цяжкі шлях да знаходжання свежасці і своеасаблівасці музыкальнай мовы.

Я перакананы, што дзея оперы, якая разгортваецца як сацыяльная меладрама, будзе глядзецца з узрастаючай цікавасцю бо ў лібрэта для гэтага ёсць усе даныя. Вось чаму маім самым вялікім жаданнем было не толькі не адстаць сваёй музыкай ад дзеі, але наадварот, наколькі магчыма ярчэй і пераканальней перадаць яе і яшчэ больш насыціць.

Такія сцэны ў оперы, як сустрэча князя і Кацярыны, фінал 1-га акта, калі па загаду князя забіраюць Кацярыну і Рыгора, выкрыццё Марыны, народнае паўстанне ў канцы оперы,—лічу найбольш эмацыянальнымі старонкамі оперы. Жыццёрадаснасцю, тэмпераментам, весялосцю і бадзёрасцю напоўнены народныя сцэны маладзёжнай гулянкі (1-шы акт) і прыезду украінскіх казакаў, іх песня і пляска, а таксама партыі старога лірніка Ахрэма і хлопчыка Алеся. Яны разам з сатырычнымі, гратэсковымі сцэнамі падгуляўшай шляхты, Дулі, ксяндза і Сцефаніі складаюць неабходную разрадку драматычных палажэнняў оперы. Артыстам у «Кацярыне» будзе што спяваць і што іграць.

Нават маленькія эпізадычныя ролі мы з лібрэтыстам імкнуліся зрабіць выпуклымі і ўражлівымі. У напісанні музыкі я ішоў ад класічных традыцый рускай опернай літаратуры і рускай савецкай оперы. Калі гавараць аб характары ўплываў на «Кацярыну», дык прада мною ўвесь час стаяла вялікай сілы палатно «Барыса Гадунова» Мусаргскага і часткова яго «Хаваншчыны». Ніхто яшчэ не паказаў у музыцы з такою «хваткаю» народ, яго мову, яго мыслі, думы і імкненні, як Мусаргскі. Узяць ад яго хаця-б часціны, крупінкі гэтай «хваткі» для мяне было заветным жаданнем.

На меры напісання «Кацярыны» я часта паказваў яе маскоўскім таварышам, якім ад душы ўдзячны за іх чуласць, водгукі і парады, — т.т. Веприку, Кабалеўскаму, Саладуха, Папову, Ліфшыцу, Бруж і інш.

У часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве «Кацярына» была паказана маскоўскай грамадскасці ў канцэртным выкананні сіламі артыстаў тэатра і студыі імя Станіслаўскага, хора Юхава пад мастацкім кіраўніцтвам К. М. Папова. Водгукі крытыкаў і грамадскасці далі мне вельмі многа хвалюючых мінут.

Зараз пачынаецца перыяд падрыхтоўкі «Кацярыны» да паказу ў тэатры для шырокай беларускай грамадскасці. Высокая ацэнка партыі і ўрада маёй кампазітарскай рабоце, а таксама водгукі сталічнай крытыкі яшчэ больш узмацняюць маё імкненне зрабіць гэты спектакль вартым беларускага народа, сказаць новае слова ў развіцці беларускага опернага мастацтва.

За парушэнне указа

Выязная сесія нарсуда ў Віцебскім драмтэатры.

8 ліпеня выязная сесія народнага суда 2-га ўчастка гор. Мінска слухала справу актора і рэжысёра Віцебскага Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра З. М. Вялікага, які груба парушыў указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года. Ён спазніўся на рэпетыцыю на 25 мінут і ў той-жа дзень увечары спазніўся на спектакль, у якім ён быў заняты, на 1 гадзіну і 25 мінут. Каб не сарваць пастаноўку, дырэкцыя вымушана была замяніць Вялікага другім, малападрыхтаваным акторам. Гэта значна адбілася на якасці спектакля.

На суд прыйшлі акторы Віцебскага драматычнага тэатра, Мінскага драматычнага тэатра, Тэатра оперы і балета і інш. За парушэнне ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР народны суд 2-га ўчастка гор. Мінска прыгаварыў рэжысёра З. М. Вялікага да 4-х месяцаў прымусовай работы па месцы працы, з вылічэннем на працягу 4-х месяцаў 15 проц. з яго зарплаты.

Тэатральная грамадскасць прыняла гэты справядлівы прыгавор народнага суда са здавальненнем.

Я. З.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Г—1525.